№№176–177
(3306–3307)

9—11 лістапада 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

СЛЫШАЛИ?

Известный юрист Гарри Погоняйло обратился в обе палаты Национального собрания с требованием создать специальные комиссии по проведению процедур досрочного смещения с должности президента Беларуси А.Г.Лукашенко

Поскольку это не рядовая инициатива и перед Национальным собранием поставлены принципиально важные, судьбоносные для нашей страны вопросы, то он одновременно направил обращение и в Центральную комиссию Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов. В нем указывается:

"Несмотря на серьезность выдвигаемых обоснований для отстранения его от власти, ни сам А.Г.Лукашенко, ни компетентные органы государства не представили в Центральную комиссию достоверных сведений, которые могли бы исключить осуществление указанных в ст.88 Конституции процедур. Эти сведения имеют существенный характер и могут служить основанием к отказу в регистрации кандидатом в Президенты А.Г.Лукашенко на выборах 2010 года.

В соответствии со стст.33, 68 ИК прошу рассмотреть данный вопрос в полном соответствии с действующим законодательством и принять решение об отказе в регистрации кандидатом в Президенты Республики Беларусь на выборах 2010 года Александра Григорьевича Лукашенко".

Параллельно копии этих документов представлены исполкому Объединенных демократических сил для использования претендентами на должность президента Республики Беларусь в ходе избирательной кампании.

Гарри Погоняйло рассчитывает, что лица, выдвигающиеся в кандидаты на главный пост в стране, также используют предложенные им правовые механизмы для отстранения от власти А.Г.Лукашенко.

Петр КУЗЬМЕНКОВ.

НУ И НУ!

Тетка Некляева набросилась «с вилами» на проверяющих

По всей Беларуси идет давление на людей, которые подписались за выдвижение кандидатом в президенты Владимира Некляева. Дошло до того, что "проверяльщики" пришли к родной тетке Владимира Некляева, которая живет в Креве (Гродненская область).

"О том, что это моя тетка, "проверяльщики", похоже, не знали: у нее другая фамилия, - рассказывает Владимир Некляев. — Спрашивают: "Вы действительно подписались за Некляева?" "Действительно подписалась". "А знаете, за какого человека вы радеете?.. Он только рассказывает да стихи пишет о том, как любит своих земляков, Крево, а на самом деле здесь и не показывается — даже на кладбище, где родители похоронены, не бывает. За могилами его родных ученики Кревской школы по поручению учителей присматривают..." Тут тетку, что называется, подняло на вилы: "А вы хоть знаете, кому всё это рассказываете? Его родной тетке! Он недавно вместе со мной в Кревской церкви был, в крестном ходе участвовал, а потом мы вместе на кладбище ходили! У меня сын и муж рядом с его родителями похоронены!.." И тетка едва не вилами этих "проверяльщиков" из дома погнала".

У Владимира Некляева, как, впрочем, и у других кандидатов в президенты, не во всех городах и весях есть "родные тетки с вилами". А надо бы, оказывается, чтобы были. Потому что кампания по дискредитации оппонентов Лукашенко только набирает ход. То ли еще будет...

ФУТБОЛ

«Шахцёр» забяспечыў сабе «серабро»

У мінулую суботу адбыліся пяць матчаў 31-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе.

Вось іх вынікі: "Нафтан" (Наваполацк) — "Днепр" (Магілёў) — 1:2, "Партызан" (Мінск) — Віцебск — 0:1, "Дынама" (Брэст) — "Тарпеда (Жодзіна) — 3:1, "Нёман" (Гродна) — "Белшына" (Бабруйск) — 2:0, "Мінск" — "Шахцёр" (Салігорск) — 1:2.

БЕСПРЕДЕЛ

Сучки и задоринки по-солигорски

«Я вам обещаю: наши выборы пройдут без сучка и задоринки».

А.Лукашенко

"Встать, суд идет!" Этими привычными словами 5 ноября в Солигорске начался необычный судебный процесс. Объединенная гражданская партия — против солигорской вертикали. В черной мантии судья Трофимчук, в синем мундире — прокурор Чернышевич. В зале суда несколько десятков неравнодушных солигорчан. Предмет спора: формирование участковых избирательных комиссий, а точнее невключение в состав оных четырех представителей ОГП.

Всего в регионе было сформировано 68 участковых избирательных комиссий. Почти все в количестве 11 человек, хотя статья 34 Избирательного кодекса устанавливает предельную планку в 19 членов. Таким образом, в комиссии можно было безболезненно включить не только Александра Цецуру, Николая Шаровара, Александра Рамаева, Виктора Молочко, но и еще более 500 солигорчан. Тем паче что ажиотажа вокруг формирования комиссий не наблюдалось. Ан нет. У местных чиновников своя арифметика, позволяющая иметь необходимые 75% в итоговом протоколе голосования.

В судебном заседании выяснилось, что процесс формирования комиссий любит тишину и не терпит длинных дискуссий, а посему никого из оппозиционеров на заседание исполкома не позвали. Естественно, что голосовали единодушно: и сам глава солигорской вертикали Рымашевский, и его заместители, и шеф местного КГБ, и вожак расплодившегося по всей стране БРСМ, и прочие члены трудового коллектива под названием *райисполком.* Свои избрали своих. И плевать им с третьего этажа, что большинство жителей Солигорска местных правителей своими не считают.

Судебное заседание продолжалось два часа, а прогнозируемый вердикт о правовой девственности решения местной вертикали судья вынесла в конце трудового дня. К чести госпожи Трофимчук, она не мешала высказать позицию целиком и полностью. И на том спасибо.

Но есть резон воспроизвести некоторую часть озвученного в суде. Солигорск — город шахтеров, и тысячи его жителей выдают на-гора золотоносную соль, а местная вертикаль намерена выдать нужные и заранее запрограммированные цифры голосования в ходе президентской кампании. И для достижения результата они готовы на все, вплоть до приостановления действия на территории города и района статьи 21 Конституции Республики Беларусь. Именно эта статья не декларирует, а гарантирует равенство прав всех граждан независимо от пола, вероисповедания и чувств, питаемых к власти. Но то, что Конституция — это коврик, о который поочередно в Солигорске вытерли ноги и прокурор, и судья, это установленный факт. И больше всех по Основному закону страны потоптался туфлями заместитель председателя райисполкома **Анатолий КАЗАКЕВИЧ**. "Мы так решили, и наше решение правильное и законное".

Вот и получается, что в Солигорске несколько сортов граждан. Сам Казакевич, безусловно, относится к высшему сорту, а члены ОГП — это уже товар второсортный. А по мнению еще одного представителя местной элиты, главного юриста исполкома Алексея Страпко, *"комиссии — это рабочий орган, в котором не надо проводить дискуссии".* И этот посыл реализован на практике в полном объеме.

Обратимся к составу участковой комиссии №16. Все 11 ее членов работают на "Шахтаспецстрое". Для того, чтобы формально вписываться в статью 34 Избирательного кодекса, четверых членов этого трудового коллектива расписали по квотам БРСМ, "Белой Руси", Союза женщин и федерации так называемых официальных профсоюзов. И не надо быть Глобой, чтобы предсказать, что председателем комиссии №16 будет тот, в подчинении кого находятся все 10 ее членов. Отказать своему начальнику эти люди просто не смогут. Не посмеют. А это значит, что зампред Казакевич может планировать любые цифры итогового протокола по этому избирательному участку. И по этой причине Анатолий Александрович и его сотоварищи по райисполкому наотрез отказались включить в состав комиссии №16 Виктора Молочко. Чужой он во всех отношениях. И председателю комиссии не будет смотреть в рот, потому что он не его начальник, выписывающий премиальные и предоставляющий отгулы. И протоколы липовые не станет подписывать, потому что человек порядочный и совестливый. А поэтому у Виктора Молочко, юриста, бывшего руководителя финансового отдела солигорской милиции, не было никаких шансов преодолеть сучки и задоринки солигорского райисполкома.

Произошедшее в Солигорске — это не исключение, это правило. К примеру, во всей Могилевщине для оппозиции не нашлось ни одного места в составе избирательных комиссий. И это уже целый сук, на котором висит и болтается вся нынешняя избирательная кампания.

Что сделала бы в правовом государстве судья Трофимчук? Она, безусловно, отменила бы решение исполкома как противоречащее статье 21 Конституции Беларуси и вынесла определение о необходимости приведения норм Избирательного кодекса в соответствие со статьей 21 Конституции Беларуси. Но мы страна послушного, молчаливого большинства.

Итак, что мы имеем в сухом остатке? Всего в составе участковых избирательных комиссий Солигорского района 704 человека, из которых 703 представляют интересы Александра Лукашенко (один представляет партию "Справедливый мир"). Ярослав Романчук, в поддержку которого в Солигорске было собрано почти четыре тысячи подписей, — ни одного (?!). А посему в здании, которое должно быть святилищем законности, в присутствии прокурора я обвинил власти Солигорска в подготовке массовых фальсификаций итогов избирательной кампании. И эти действия осознанные и спланированные. Власти, и не только в Солигорске, решили создать себе максимум комфорта и удобств. Действуют по принципу: нет в комиссии оппозиционера, нет и проблемы. Но она остается и нарастает как снежный ком. Ни один человек в здравом рассудке не примет итоги выборов, в которых считают голоса представители только одного кандидата в президенты... А это значит, 19 декабря не будет поставлена точка в президентской кампании. События только начнут разворачиваться.

Анатолий ЛЕБЕДЬКО.

СТРАТЫ

Памёр Міхаіл Савіцкі

На 89-м годзе жыцця памёр народны мастак Беларусі, акадэмік Міхаіл Савіцкі.



Міхаіл Савіцкі быў вязнем канцлагераў Дахау і Бухенвальд, з гэтай трагічнай старонкі лёсу нарадзіўся самы пранікнёны цыкл ягоных твораў "Лічбы на сэрцы".

Развітанне з Міхаілам Савіцкім адбудзецца 10 лістапада ў Цэнтральным доме афіцэраў. Грамадзянская паніхіда пройдзе з 10.00 да 13.00. Мастака пахаваюць на Усходніх могілках Мінска.

ВІЗІТ

Еўракамісар Фюле праігнаруе кандыдатаў у прэзідэнты

Падчас візіту ў Беларусь 14—15 лістапада еўракамісар па пытаннях пашырэння і еўрапейскай палітыкі суседства Штэфан Фюле не будзе сустракацца з кандыдатамі на пасаду прэзідэнта.

Пра гэта TUT.BY паведаміла прэс-сакратар камісара Анка Падарару.

— Галоўная мэта візіту Штэфана Фюле ў тым, каб выказаць падтрымку беларускаму народу і грамадзянскай супольнасці ў гэты важны момант у палітычным жыцці краіны напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, — паведаміла прадстаўніца Еўракамісіі.

Плануецца, што ў Мінску еўракамісар сустрэнецца з прадстаўнікамі арганізацый грамадзянскай супольнасці, а таксама з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым.

Нагадаем, сёлета Штэфан Фюле ўжо быў у Беларусі. Падчас двухдзённага візіту 8—9 ліпеня была агучана інфармацыя аб намеры стварэння Сумеснага прамежкавага плана — "дарожнай карты" далейшых узаемадачыненняў Беларусі і Еўрасаюза, мэта якога — правядзенне ў нашай краіне рэформ у сферы палітыкі, дэмакратыі і правоў чалавека, у судовай сістэме і эканоміцы. Наўзамен ЕС абяцае стаць больш адкрытым для супрацоўніцтва з Беларуссю і даступным для беларускіх грамадзян.

На думку экспертаў, менавіта Сумесны прамежкавы план, які ўжо падрыхтаваны Еўракамісіяй, і стане галоўным прадметам перамоў паміж Фюле і Мартынавым.

УВАГА!

Ідзе падпіска на «Народную Волю» на першую палову 2011 года.

Вы — з «Народнай Воляй», «Народная Воля» — з Вамі!

ПАЛІТКУХНЯ

Ад аднаго закліку «Сыходзь!» некаторыя гора-палітыкі разбегліся ў кусты

24 лістапада, у дзень гадавіны рэферэндуму 1996 года, у выніку якога беларуская Канстытуцыя была зменена так, што прэзідэнт атрымаў царскія паўнамоцтвы, а ўсе астатнія галіны ўлады яму цалкам падпарадкаваліся, беларуская апазіцыя запланавала акцыю на Кастрычніцкай плошчы.

Задумвалася яна як акцыя, на якой павінен прагучаць зварот да Аляксандра Лукашэнкі "Сыходзь!". І як генеральная рэпетыцыя той самай Плошчы, выйсці на якую прэтэндэнты на прэзідэнцкую пасаду ад апазіцыі заклікаюць выбаршчыкаў у дзень галасавання.

Алесь Міхалевіч адразу заявіў, што не вызначыўся са сваім стаўленнем да вулічнай дэмакратыі, і ад падрыхтоўкі любых акцый дыстанцыраваўся.

Каманда **Андрэя Саннікава** заняла пазіцыю, што кандыдатаў павінна быць як мага больш і што ўсе яны павінны заклікаць людзей да акцый пратэсту з патрабаваннем правядзення ў нашай краіне сумленных выбараў. Таму Саннікаў прымае ўдзел толькі ў кансультацыях наконт правядзення акцыі пратэсту 19 снежня.

Літаральна ў апошні момант, напярэдадні прэс-канферэнцыі, на якой прэтэндэнты на прэзідэнцкую пасаду павінны былі абвясціць, што разам пойдуць да выбаршчыкаў 24 лістапада, без усялякіх тлумачэнняў адмовіўся ўдзельнічаць у ёй вылучэнец Партыі БНФ **Рыгор Кастусёў**...

Такім чынам, адзінства пакуль не атрымліваецца.

"Рэпетыцыю" 24 лістапада вырашана праводзіць у фармаце сустрэчы кандыдатаў у прэзідэнты з выбаршчыкамі. Маладзёжныя актывісты прыйдуць на яе з заклікам да Аляксандра Лукашэнкі "Сыходзь!". А вось пра больш сур'ёзнае аб'яднанне пакуль гаварыць не прыходзіцца.

Разважанні прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду аб тым, ці пойдуць яны на выбары разам і ці патрэбна ім адзінства, чытайце ў наступным нумары "Народнай Волі".

Алена НОВІКАВА.

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

Мы не солдаты тайной войны

Ведется активная работа по созданию общественной организации "Национальная лига офицеров". Нравится это кому-то или не нравится, но она будет сформирована и займет принципиальную позицию в жизни страны.

Планируется, что "Национальная лига офицеров" будет вести работу с ветеранами и офицерами запаса КГБ и военной контрразведки, представителями других силовых структур. Возглавит это направление офицер запаса КГБ Виктор Петрович Савицкий.

В ответ на выступления в СМИ руководителей общественной организации ветеранов КГБ "Честь" я от имени нашего оргкомитета заявляю следующее: мы никогда не ставили и не ставим своей целью внести раскол в деятельность любой общественной организации; мы всегда выступали и выступаем против того, чтобы в нашей стране офицер смотрел на офицера через прорезь прицела; в нашу организацию вступают офицеры, имеющие свое, а не навязанное сверху мнение, любящие свою Родину, имеющие четкое представление о своем долге перед Отечеством.

Владимир АРЕСТОВ,
сопредседатель оргкомитета по созданию ОО "Национальная лига офицеров".

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Уладзімір АСІПЕНКА:

«Я нават ведаю, хто мяне "заказаў" і як гэта рабілася»

У мінулую пятніцу ўмоўнадатэрмінова быў вызвалены з Івацэвіцкай калоніі Уладзімір Асіпенка, які праходзіў па адной справе з Мікалаем Аўтуховічам. Уладзімір расказаў "Народнай Волі", як яму жылося ў няволі і чым ён плануе заняцца далей.

Асіпенку, як і Аўтуховіча, абвінавачвалі ў падрыхтоўцы тэрактаў супраць высокапастаўленых чыноўнікаў, але ў судзе гэта пацвярджэння не знайшло. Уладзімір Асіпенка, аднак, быў прызнаны судом вінаватым у незаконных дзеяннях са зброяй і атрымаў тры гады зняволення. Сваёй віны ён не прызнаў і казаў, што яму адпомсцілі за антыкарупцыйную дзейнасць і салідарнасць з Аўтуховічам. За кратамі Уладзімір Асіпенка знаходзіўся з 8 лютага 2009 года.

— Я думаў, што мяне вызваляць толькі 8 лютага наступнага года, — кажа суразмоўца. — Па амністыі мне знялі год, і з улікам гэтага 8 лютага якраз заканчваўся тэрмін зняволення. Хоць была думка, што могуць выпусціць і перад выбарамі. Не памыліўся.

— Што было складаней за ўсё за кратамі?

— Ды не сказаў бы, што нешта было вельмі ўжо складана. Я — былы ваенны, таму, як кажуць, не ў навінку розныя "тяготы и лишения". Я прытрымліваўся нейтральнай пазіцыі — не кантактаваў ні з "блатнымі", ні з адміністрацыяй. А калі сам па сабе, дык лягчэй.

— Як ставіліся "калегі"?

— Нармальна, з павагай.

— Ведалі пра вашу гучную справу?

— У СІЗА ў камеры ведалі ўсе. Там былі, скажам так, начытаныя людзі. А на "зоне" кантынгент самы розны, а таму і інтарэсы розныя. Некаторыя казалі, што дыму без агню не бывае, а таму, маўляў, сам вінаваты, што патрапіў за краты.

Я ім тлумачыў, што мая віна толькі ў тым, што сказаў праўду пра сваіх былых начальнікаў. І за гэта мне адпомсцілі. Ужо ў СІЗА я канчаткова ў гэтым пераканаўся. Я нават ведаю, хто мяне "заказаў" і як гэта рабілася.

— З Мікалаем Аўтуховічам сувязь падтрымліваў?

— Не, ніякай сувязі не было. Даведваўся аб ім з "Народнай Волі". Ведаю, што ён хоча, каб следчыя і аператыўнікі, якія вялі нашу справу, панеслі пакаранне, і я поўнасцю Мікалая падтрымліваю. Упэўнены, што яго хутка вызваляць, а таму будзем разам дабівацца справядлівасці. Усё будзе даведзена да лагічнага завяршэння.

— Чым зараз плануеце займацца?

— На гаспадарцы трэба папрацаваць, бо сям'я ж колькі часу была без карміцеля. Мне тры месяцы яшчэ трэба дацярпець да завяршэння майго тэрміну пакарання, таму ў гэты перыяд за любое парушэнне могуць адправіць назад у калонію. Нельга выязджаць за межы краіны, забаранілі хадзіць на паляванне... Нічога, дацерпім. Зараз жа я проста шчаслівы, што зноў апынуўся побач з роднымі.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
9—11 ЛІСТАПАДА 2010 г.

С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ

Революция и бархатный кролик

Тихо прошелестело календарным листом 7 ноября. Хотя в белорусском государственном реестре этот день еще значится праздником, за исключением Голубевой и Камая с десяткомдругим стариков, никто его не отмечал. Наступило-таки время, когда мы равнодушно оглядываемся на свое недавнее (по историческим меркам) прошлое. Нет агрессии. Но и неформального интереса нет. Чем отозвались на этот раз в душе слова "Октябрьская революция", "Ленин"? Практически ничем. Очень многие считают Октябрь трагедией, но, знаю, им ответят немногие другие, до сих пор верящие, что это был прорыв, пусть и с кровью, огромнейшими жертвами, но к лучшему будущему. Пространство для спора остается. А спорить не хочется... Прошло каких-то 20 лет, и эта тема, мне кажется, стала уходить из публицистики, из газет в науку, в историю.

Говорят, теперь Европа интересуется Октябрем больше, чем мы сами: прочитала недавно, что во Франции в Музее музыки открылась выставка "Ленин, Сталин и музыка", где советская идеология представлена сквозь призму культуры — от авангардизма до бюрократического соцреализма. Нам такие изыски не по плечу. А, собственно, почему? Разве недостаточно нашлось бы материала? Но у нас в Доме-музее I съезда РСДРП (филиале Национального исторического), работает сейчас выставка "Бархатный кролик"! Насмешка? Если бы... Никакого умысла! Обыкновенная обыденность (простите за тавтологию). А это, скажу я вам, жуткая вещь. Потому что беспощадная. Любой миф или герой под покрывалом обыденности, как под пылью, превращается... вот-вот, в мягкого кролика. "Вы делаете игрушки для детей своими руками? Поделитесь своими творениями с нами на время проведения выставки..." Эта абсурдная в стенах филиала Государственного исторического музея экспозиция вполне может претендовать на Игнобелевскую (антипод серьезной Нобелевской) премию: "за достижения, которые сначала вызывают смех, а затем раздумья".

Смех и раздумья у маленького музея прямо-таки обуревают. Летом здесь были представлены экзотические бабочки — чудо как хороши! А когда-то, помню, еще в середине 1990-х, в Домике-музее вообще продавали мягкую мебель. Это, конечно, зашкаливало... Слишком обнажился будущий лик его величества чистогана. Хотя, не скрою, тогда в душе был элемент злорадства — за лицемерие, думалось, компартия платит, за ханжество. Но злорадство давно прошло. Теперь хочется, чтобы все стояло на своих местах. Чернить историю не надо. И отбеливать, как на "Линии Сталина", конечно, тоже глупо. Хочется, не побоюсь этого слова, благородной середины. Но на середину, как выясняется, нет средств — недаром она в народе зовется золотой. И бьется, судя по всему, "Домик" за прибыль, за жизнь, тяжело жить музею на одну научную (или псевдонаучную) экспозицию. Нужны коммерческие проекты.

Мне согласиться с этим, признаюсь, трудно. Коробит пошлое соседство. Впрочем, я о другом.

Во Франции до сих пор создаются научные труды о Великой Французской революции — и это при том, что отношение к этому событию в обществе полярное, неоднозначное. Но наука есть наука! И, как сказал один известный политик, прошло слишком мало времени, чтобы давать французской революции окончательную оценку. Давайте и мы займемся только фактами. В Российской империи, куда входила Беларусь, в конце XIX века ширилось революционное движение, в Минске проходил первый подпольный организационный съезд, потом в стране разразилась революция, по ряду причин победили большевики, мы стали жить в СССР. Факты многим не нравятся, но музейная площадка должна оставаться местом, где все-таки служат науке. По сути, **музей должен быть хорошим учебником истории.** Нельзя оставлять общество вообще без навигации. Чистки истории от "вчерашних мифов" могут незаметно превратиться вообще в стерилизацию памяти. И потом, практика показывает: свято место пусто не бывает — расчищенное место заполнится мифами сегодняшними.

Думаете, не будет перегибов и приукрашивания? С нашей-то привычкой лоб разбивать...

Елена МОЛОЧКО.

Ці пакараюць тых, хто вёў справу Мікалая Аўтуховіча?

Учора ветэраны вайны ў Афганістане накіравалі ў Генеральную пракуратуру Беларусі заяву з патрабаваннем разабрацца і пакараць тых, хто вёў справу ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі.

Нагадаем, што пасля арышту прадпрымальнікам інкрымінаваліся такія сур'ёзныя абвінавачанні, як падпал маёмасці былога начальніка Ваўкавыскага РУУС Сяргея Кацубы і мясцовага падатковага інспектара Сяргея Мандзіка, падрыхтоўка тэракта супраць старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі і замах на жыццё намесніка міністра па падатках і зборах Беларусі Васіля Камянко. Аднак у судзе ўсе гэтыя абвінавачанні былі зняты. У выніку Мікалай Аўтуховіч быў асуджаны на 5 гадоў і 2 месяцы за незаконнае набыццё і захоўванне 5 патронаў да паляўнічай вінтоўкі, а Уладзімір Асіпенка — на 3 гады зняволення.

— На судзе высветлілася, што падчас вядзення следства было шмат фальсіфікацый, — кажа праваабаронца, ветэран-"афганец" **Алег ВОЛЧАК**. — Суд, на наш погляд, таксама не да канца разабраўся ў справе. Таму мы прапануем Генеральнай пракуратуры разабрацца і ўзбудзіць крымінальную справу супраць тых асоб, якія мелі дачыненне да вышэйназванага. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў мы хацелі б яшчэ раз нагадаць грамадскасці, што ў нашай краіне застаюцца палітзняволеныя.

— Гэтая справа з самага пачатку была палітычная, — дадае сустаршыня аргкамітэта па стварэнні грамадскага аб'яднання ветэранаў вайны ў Афганістане "Абаронцы Айчыны" **Аляксандр КАМАРОЎСКІ**. — Нагадаю, што Мікалая Аўтуховіча арыштавалі пасля таго, як ён разам з некаторымі другімі "афганцамі" адмовіўся прымаць узнагароду ад кіраўніка краіны ў знак пратэсту супраць адмены льгот для ветэранаў вайны ў Афганістане. Ды і сам суд паказаў, як "рабілася" гэтая справа. Многія сведкі адкрытым тэкстам заяўлялі, што следчыя застаўлялі іх даваць паказанні. Зараз мы ў чарговы раз нагадваем, што супраць тых, хто вёў следства, трэба ўзбуджаць крымінальную справу. І заклікаем прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду далучыцца да нашай акцыі.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЭКСПЕРТИЗА

Борис ЖЕЛИБА,
профессор, доктор экономических наук

Дисконтная экономика

Накануне выборов власть осыпает народ дарами как из рога изобилия. Но в реальности никакого "рога" нет, экономика в упадке.

Если подходить к проблеме с технической стороны, то напечатать новые банкноты несложно. Но экономические законы не обманешь. По данным "Белстата", реальная зарплата по стране снижается уже второй месяц, то есть все прибавки съедены инфляцией. Наибольшее снижение отмечено в топливной отрасли (более 10%), в сельхозпроизводстве (более 5%), около 30 тысяч рублей в среднем потеряли работники химии и нефтехимии.

На этом фоне и появляются мрачные сценарии нашей жизни в новом году. Например, инфляция — 25—30%, и курс доллара к концу 2011 года — 4,7—5 тыс. рублей (Я.Романчук). А это, считай, обвальная девальвация белорусского рубля...

Сейчас в Беларуси ситуация хуже, чем в Греции (Л.Злотников). Страну ждет передел собственности (Л.Заико) и т.д. и т.п. Эти и другие заявления прогнозного характера оппозиционных экономистов порой весьма аргументированы экономическими выкладками. И если правительство не примет экстренных мер, то так оно и будет.

Главный вопрос, на мой взгляд, в том, где взять в следующем году необходимые валютные средства. Их не напечатаешь... Приведем некоторые данные экономистов, так сказать, негосударственного сектора. В 2009 году Беларусь назанимала за границей 9,26 млрд дол., при этом пришлось вернуть 4,95 млрд дол. ранее взятых долгов. В 2010 году придется вернуть еще больше. Привлечено валюты в экономику в текущем году на 1,14 млрд дол. меньше, чем в прошлом. По итогам 9 месяцев отрицательное сальдо внешней торговли достигло почти 6 млрд дол. против 5 млрд в прошлом году за аналогичный период. В этом году отрицательное сальдо наблюдается и в торговле с Европейским Союзом. Потребность в валюте на вторую половину текущего года оценивается в 6—7 млрд долларов.

В следующем году не будет многого из того, что было в этом. Не будет траншей от российского "Газпрома": свою половину акций "Белтрансгаза" он уже выкупил. По крайней мере в первой половине года не будет кредитов МВФ (представители Фонда вообще связали выделение своих кредитов с соответствием выборов президента международным стандартам). От России, по понятным причинам, тоже вряд ли чего дождешься. К тому же остается проблема, как полностью загрузить мощности наших нефтезаводов — основных добытчиков валюты. Для поддержания экономики страны в работоспособном состоянии, по подсчетам, необходимо в месяц не менее 1 млрд долларов. Доказательство тому — европейский валютный заем Минфина в эквиваленте 1 млрд дол., который мы "проели" практически за месяц. Он пошел в основном на поддержание курса белорусского рубля. Данные впечатляют экономистов.

Впечатляют они и население страны. Это никак не страшилки кандидатов в президенты, как заявляют представители Нацбанка. С 2009 года валютные депозиты физических лиц превышают по объемам рублевые. Покупка населением наличной валюты уже несколько месяцев превышает ее продажу банкам. Возрастает и число вкладчиков, желающих перевести рублевые сбережения в валютные. Начались проблемы с обеспечением валютой банковских обменных пунктов. Особенно на периферии, где в обменники надо приходить с утра. Если состояние платежного баланса страны будет ухудшаться (а признаков улучшения ситуации во внешней торговле не видно), то спрос населения на валюту может достигнуть 1 млрд дол. в год.

Правительство, Минфин, естественно, приняли решение форсировать размещение на еврорынке второго выпуска облигаций на 1 млрд дол., который планировался в следующем году. Эти займы для нас весьма дороги. Купонный доход по белорусским евробондам первого размещения составляет 8,75%, тогда как Украине удалось разместить пятилетние евробонды под 6,875% годовых. Как объяснили белорусские профильные чиновники, дешевле бы у нас не взяли, так как это первое публичное размещение белорусских государственных облигаций за рубежом. И то верно, нас никто не знает как эмитента. В то же время специалистами было заявлено, что размещение евробондов целесообразно лишь в том случае, если темпы экономического роста в стране будут превышать их доходность. А темпы роста нашего ВВП сегодня оцениваются в 6,6%. Но что делать, если валюта нужна буквально любой ценой!

С одной стороны, по грубым подсчетам аналитиков, в следующем году нам на первое время нужно не менее 3 млрд дол. помощи. С другой — если сравнивать с десятками миллиардов, которые МВФ и Евросоюз дают Греции, это немного. Наш валовой долг достиг половины ВВП, но многие развитые страны имеют долг и больше своего ВВП. Но потому они и развитые, что его обслуживание для них не проблема. У них другие масштабы. Для государств еврозоны свой евро и есть мировая валюта, в которой так нуждается Беларусь. А мы близки к своему критическому долговому порогу...

Любопытно посмотреть масштабы экономики Беларуси на фоне стран Центральной и Восточной Европы. По зарубежным данным, наш ВВП составляет 46 млрд дол., что составляет 11.600 дол. на душу населения. ВВП Польши — 428 млрд дол. и 17.900 на душу населения. ВВП Чехии — 192 млрд и 25.100 дол. на одного жителя. Россия, конечно, гигант (ВВП — 1,232 трлн дол.), но на душу населения приходится 15.100 долларов. ВВП Великой России сопоставим с ВВП Испании. Что уже говорить о ВВП Германии, который составляет не менее 4 трлн долларов, а ВВП Японии и Китая приближаются к 5 трлн долларов. Нет равных США, ВВП которых свыше 14 трлн долларов. Увы, Беларусь на этом фоне карлик. Но ведет себя неадекватно реальному положению.

Германия покупает нефть у более чем десятка стран и не зависит от одного-двух поставщиков, потому что покупает сырье на мировом нефтяном рынке по рыночным ценам. У нас тоже наметился второй поставщик — Венесуэла. И это правильно, надо диверсифицировать поставки нефти и газа и не зависеть от одной России. По сообщениям СМИ, Лукашенко и Чавес в последний визит договорились о 30%-ной скидке на венесуэльскую нефть. Но она все равно значительно дороже российской. Белорусская экономика не в состоянии покупать энергоносители по мировым ценам. Ей постоянно нужны скидки (дисконты), преференции как следствие однобокости экспорта и зависимости нашего рынка от российского. Этакая дисконтная экономика. Потому и покупаем нефть за тридевять земель, руководствуясь принципом личных политических симпатий главы белорусского государства. На него у правительства и надежда. Неужели "не стрельнет" новый старый президент эти пару-тройку миллиардов долларов у кого-то из своих друзей? Почему бы не выпросить у Китая миллиард-другой долларов свободных денег? А то он нас все время норовит кредитовать в товарной форме — оборудованием, материалами, специалистами-китайцами и т.д., но отдавать эти кредиты придется не борзыми щенками, а валютой.

Все равно придется примириться с Россией. Есть что продать и из госсобственности. Да и нефть можно ближе покупать: у Ирана и арабов, например, и доставлять через опробованные порты и маршруты Украины. Мне представляется, что недостающие миллиарды власти все же найдут. Поэтому на следующий год мрачных прогнозов не разделяю. В том, что касается краткосрочного периода, я оптимист. Думаю, инфляция не выйдет за рамки 12—13%, а курс доллара к концу 2011 года ожидаю в пределах 10%-ного коридора — 3400—3500 белорусских рублей. Не зря глава Администрации президента заявил, что Беларуси не нужны три миллиарда евро помощи Евросоюза, если он будет требовать политических уступок, т.е. провести президентские выборы в соответствии с международными стандартами. Значит, на что-то власть рассчитывает.

Но если посмотреть на более отдаленные временные горизонты, то на дисконтной экономике далеко не уедешь. Пути реформирования давно известны и лежат в плоскости ее либерализации, приватизации, диверсификации экспорта. Прямые иностранные инвестиции, которых нам так недостает, идут в экономики, отвечающие рыночным стандартам и государствам, придерживающимся демократических ценностей. Смогут ли последовательно идти в этом направлении белорусские власти — покажет ближайшее время. Здесь, во всяком случае, я пессимист. Тем не менее, когда ко мне все чаще обращаются за советом коллеги по работе, знакомые со схожим вопросом: что делать с имеющимися у них рублевыми вкладами, — то, понимая, к чему приведет массовый отток рублевых депозитов населения из банковской системы (банки без ресурсов, экономика без кредитов), отвечаю: не дергайтесь, но внимательно отслеживайте ситуацию...

ПАЛІТКУХНЯ

«Мёртвыя душы» на службе ў Кастусёва і Статкевіча...

Праверка выбарчымі камісіямі подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у прэзідэнты выявіла дзіўныя і адначасова сумныя факты. Так, у Жодзіне несапраўднымі прызнаны ўсе подпісы, якія былі пададзены за вылучэнне намесніка старшыні Партыі БНФ Рыгора Кастусёва і старшыні аргкамітэта па стварэнні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалая Статкевіча.

Пра гэта карэспандэнту "Народнай Волі" паведаміў сябра жодзінскай гарадской выбарчай камісіі па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Аляксандр Валчанін.**

Дэмакрат Валчанін, які асабіста бачыў падпісныя лісты, не апраўдвае "калег" па апазіцыйным лагеры.

— На пасяджэнні гарадской выбарчай камісіі разглядалася пытанне сапраўднасці подпісаў, пададзеных за вылучэнне кандыдатаў у прэзідэнты, — гаворыць Аляксандр Валчанін. — *Усяго за дзевяцярых прэтэндэнтаў здалі на праверку подпісы ў Жодзінскую гарадскую выбарчую камісію. Сярод іх — Уладзімір Няклаеў, Андрэй Саннікаў, Алесь Міхалевіч, Аляксандр Лукашэнка, Віталь Рымашэўскі, Яраслаў Раманчук, Рыгор Кастусёў, Мікола Статкевіч, Віктар Цярэшчанка. У выніку прызнаны несапраўднымі ўсе подпісы, пададзеныя за вылучэнне Рыгора Кастусёва і Міколы Статкевіча. За вылучэнне намесніка старшыні Партыі БНФ было пададзена 158 подпісаў, за Міколу Статкевіча — 395. Адразу правяраліся 15 працэнтаў здадзеных за ўсіх прэтэндэнтаў подпісаў. У падпісных лістах за вылучэнне Кастусёва і Статкевіча былі знойдзены шматлікія памылкі і недарэчнасці. Пасля праверылі яшчэ 20% — тое самае. Сталі тэлефанаваць людзям, чые подпісы стаялі ў лістах. Высветлілася, што нехта папросту не падпісваўся за згаданых прэтэндэнтаў, нехта не мог подпісацца фізічна, бо знаходзіўся ў ЛПП, некага ўвогуле ў горадзе не было... Усе гэтыя факты ўключаны ў адпаведныя акты, якія падпісалі ўсе сябры Жодзінскай гарадской выбарчай камісіі. Прыкра гэта.*

Хаця адзначу, што за Кастусёва і Статкевіча ў Жодзіне сабрана найменшая колькасць подпісаў з усіх кандыдатаў. А вось ініцыятыўныя групы Уладзіміра Няклаева, Віталя Рымашэўскага, Яраслава Раманчука і Алеся Міхалевіча папрацавалі добра — да подпісаў за іх вылучэнне пытанняў няма. Людзі за іх сапраўды падпісваліся.

Скажу шчыра, подпісы за ўсіх прэтэндэнтаў правяралі аднолькава — сам гэта бачыў, сам у гэтым удзельнічаў. Таму абвінавачаць мяне ў перадузятасці наўрад ці атрымаецца. Наадварот. Як сябра апазіцыйнай партыі, я, можа, і быў бы зацікаўлены ў зацвярджэнні сапраўднымі подпісаў усіх апанентаў Лукашэнкі, але факты — рэч упартая. Дарэчы, за вылучэнне Аляксандра Лукашэнкі ў Жодзіне пададзена 6194 подпісы. З іх 33 пазней былі адкліканы сябрамі ягонай ініцыятыўнай групы і толькі 5 прызнаны несапраўднымі.

А вось калі вярнуцца да сітуацыі вакол подпісаў за вылучэнне Кастусёва і Статкевіча, то мне цяжка меркаваць, чаму сябры іх ініцыятыўных груп так неахайна спрацавалі. Напэўна, лепш пытацца ў іх саміх..."

Чаму ў здадзеных у Жодзіне подпісах за вылучэнне Кастусёва і Статкевіча апынуліся "мёртвыя душы"? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да саміх "фігурантаў" справы.

Намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў даў такі каментарый: "*Мне складана гэта неяк зараз каментаваць. Я асабіста гэтыя подпісы не бачыў. У нашых зборшчыкаў матэрыяльнай матывацыі для таго, каб гнаць вал, не было. Што сабралі людзі — тое і падалі... У чым там заключаецца прычына непрызнання гэтых подпісаў, я дакладна не ведаю. Але ў любым выпадку трагедыі з гэтага не рабілю, бо гэта адзінкавы выпадак... Па краіне ў цэлым подпісы сабраны і здадзены нармальна".*

Логіка, мякка кажучы, дзіўная. У Жодзіне нехта з каманды наўпрост дыскрэдытаваў прэтэндэнта на прэзідэнцкую пасаду. Але ён не ўбачыў у гэтым трагедыі...

Калега па няшчасці Рыгора Кастусёва — яшчэ адзін патэнцыяльны кандыдат у прэзідэнты Мікола Статкевіч — у сваю чаргу сказаў "Народнай Волі" наступнае: *"Магчыма, у гэтым выпадку проста недапрацавалі прадстаўнікі маёй ініцыятыўнай групы. Подпісы за маё вылучэнне збіраў вядомы ветэран-афганец Аляксандр Камароўскі з сябрамі. І яны іх рэальна збіралі. Ну і што, што людзі не пражываюць у Жодзіне? Яны ж ставілі подпісы за маё вылучэнне. Для мяне галоўнае, што гэтыя подпісы сабраны добрасумленна".*

Сам Аляксандр Камароўскі таксама не згодны з тым, што ўсе жодзінскія подпісы за вылучэнне Статкевіча трэба прызнаваць несапраўднымі: *"Там, наколькі я ведаю, пэўныя праблемы ў подпісах толькі на трох з сарака аркушах. Мы з гэтым будзем разбірацца..."*

Відавочна адно: калі прэтэндэнты, якія трапілі ў вельмі непрыстойную сітуацыю, будуць праз суд дамагацца адмены актаў Жодзінскай выбарчай камісіі, даказваючы, што подпісы ў іх падтрымку ставілі рэальныя людзі, а не мёртвыя душы, — гэта адно. А калі ўсё абмяжуецца няўцямнымі каментарыямі — гэта іншае. У любым выпадку кропкі над "і" павінны быць расстаўлены да 24 лістапада — менавіта да гэтага дня кандыдаты ў прэзідэнты павінны быць зарэгістраваны.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

НУ І НУ!

Правальскі сабраў 600—700 подпісаў, астатнія — ксеракопіі

У прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта Уладзіміра Правальскага толькі 700 рэальных подпісаў, паведаміла журналістам старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.

Паводле яе слоў, астатнія подпісы — гэта ксеракопіі гэтых сямісот подпісаў.

Ярмошына таксама адзначыла, што ва ўсіх прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта выбарчыя камісіі выяўляюць "некарэктныя подпісы". "Практычна ўсе кандыдаты страцілі па некалькі тысяч подпісаў, але пакуль ва ўсіх у іх, за выключэннем Правальскага, застаецца не менш за 100 тысяч", — сказала Ярмошына.

Праверка, праўда, працягваецца.

Праваабаронцы: апазіцыя дыскрымінуецца

Прадстаўнікі праваабарончых арганізацый — Беларускага Хельсінкскага камітэта і незарэгістраванага праваабарончага цэнтра "Вясна" — падвялі папярэднія вынікі назірання за фарміраваннем участковых выбарчых камісій.

Выснова несуцяшальная: выбарчая кампанія ў Беларусі праходзіць пры дыскрымінацыі апазіцыі.

Юрыст праваабарончага цэнтра "Вясна" Валянцін Стэфановіч паведаміў: "З 84.084 прадстаўнікоў, вылучаных у склад 6386 участковых камісій палітычнымі партыямі, грамадскімі аб'яднаннямі, працоўнымі калектывамі і групамі грамадзян, толькі 1073 былі вылучаны апазіцыйнымі палітычнымі партыямі. І тут відавочна дыскрымінацыйнае стаўленне да сябраў апазіцыйных партый з боку выканкамаў. У склад участковых камісій з 1073 вылучаных былі ўключаны толькі 183 чалавекі — гэта 17,1%. А калі браць паказчык па ўсёй краіне, то ва ўчастковыя камісіі ўключана толькі 0,25% апазіцыянераў ад агульнай колькасці вылучэнцаў. Усе астатнія — гэта людзі з лаяльных сённяшняй уладзе палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый.

Старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэта Алег Гулак адзначыў: "Фарміраванне участковых выбарчых камісій — гэта як працверазальны душ пасля адносна свабоднага этапа збору подпісаў. Пасяджэнні выканкамаў і мясцовых адміністрацый па фарміраванні ўчастковых выбарчых камісій адбываліся ва ўмовах адноснай адкрытасці для назіральнікаў, але мелі выключна фармальны характар. У большасці выпадкаў яны зводзіліся да хуткага на безальтэрнатыўнай аснове зацвярджэння спісаў складаў камісій, падрыхтаваных напярэдадні пасяджэнняў у закрытых рэжымах. У шэрагу гарадоў, як, напрыклад, у Бабруйску, Жодзіне, Барысаве назіральнікі ад БХК увогуле не былі дапушчаны на пасяджэнні, дзе фарміраваліся ўчастковыя камісіі. Пры гэтым быццам бы лічыцца, што выбарчы працэс у Беларусі адкрыты..."

З нагоды нядопуску сваіх прадстаўнікоў за назіраннем пры фарміраванні ўчастковых выбарчых камісій Беларускі Хельсінкскі камітэт падаў 77 скаргаў у суды па ўсёй краіне. "Ілюзій наконт таго, што суды задаволяць гэтыя скаргі, у нас няма, — гаворыць Гулак. — Але падаваць іх было варта хаця б дзеля таго, каб паказаць сапраўдную "адкрытасць" беларускіх выбараў".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

12 першых

Прыбыццё місіі назіральнікаў АБСЕ ў Беларусь чакаецца 12 лістапада. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ***Мікалай Лазавік****.*

Паводле яго слоў, у чацвер чакаецца прыбыццё ў Мінск асноўнай групы міжнародных назіральнікаў місіі АБСЕ з 12 чалавек на чале з паслом Гертам Арэнсам. Менавіта ён ужо трэці раз будзе кіраваць місіяй міжнародных назіральнікаў АБСЕ на тэрыторыі краіны.

"Асноўная група з'яўляецца штабам місіі па адсочванні ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў краіне, па падрыхтоўцы да разгортвання дзейнасці доўгатэрміновых і кароткатэрміновых назіральнікаў", — растлумачыў сакратар ЦВК. Удзельнікі асноўнай групы будуць таксама складаць прамежкавыя і падагульняючыя справаздачы аб ходзе прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў Беларусі для БДІПЧ АБСЕ.

Плануецца, што 15 лістапада з кіраўніцтвам місіі сустрэнецца старшыня ЦВК Беларусі Лідзія Ярмошына.

Агульная колькасць групы доўгатэрміновых назіральнікаў АБСЕ ў Беларусі — 40 чалавек. Для кароткатэрміновага назірання ў краіну павінны прыбыць амаль 400 замежных назіральнікаў.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
9—11 ЛІСТАПАДА 2010 г.

ШОК!

Чужым тут не месца

У склад участковых камісій па выбарах прэзідэнта Беларусі ўключаны толькі 183 прадстаўнікі апазіцыйных палітычных партый, хаця ўсяго было вылучана 1073 прадстаўнікі.

Ва ўчастковыя камісіі ўключана 54 прадстаўнікі Аб'яднанай грамадзянскай партыі (вылучалася 505), 78 — Беларускай партыі левых "Справядлівы свет" (283), 36 — Партыі БНФ (201), 10 — Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) (48), 5 — Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады (29) і ніводнага — Кансерватыўна-хрысціянскай партыі — БНФ (7).

У той жа час з 705 прадстаўнікоў, вылучаных праўладнай Камуністычнай партыяй Беларусі, у склад камісій уключаны 545 чалавек. 428 сваіх прадстаўнікоў ва ўчастковых камісіях будзе мець Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (вылучалася 468 чалавек), 406 — Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя (420), 144 — Беларуская аграрная партыя (147), 63 — Рэспубліканская партыя (68).

У склад участковых камісій таксама ўключана 9556 прадстаўнікоў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, 4126 — Беларускага саюза жанчын, 3925 — РГА "Белая Русь", 3860 — Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, 2222 — Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў. Зразумела, што ўсе гэтыя людзі — ад улады.

Такім чынам, з 70.815 членаў выбарчых камісій толькі 183 чалавекі будуць прадстаўляць апазіцыю — прыблізна 0,25%. Вось гэта і ёсць рэальны паказчык абяцанай уладамі дэмакратызацыі выбараў.

Нагадаем, што прадстаўнікі апазіцыі, у тым ліку дэмакратычныя прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта, неаднаразова заяўлялі, што ўключэнне іх прадстаўнікоў у склад участковых камісій павінна быць абавязковай умовай правядзення дэмакратычных выбараў. Такім чынам, умова не выканана.

Каардынатар кампаніі "За справядлівыя выбары" Віктар Карняенка ў сувязі з вынікамі фарміравання выбаркамаў заявіў: "На вялікі жаль, прэзідэнцкія выбары праходзяць паводле сцэнарыя, аналагічнага мінулым гадам. Улады не гатовы пайсці на рэальную лібералізацыю выбарчага працэсу".

Але ці стане гэта падставай для зняцця апазіцыйных кандыдатаў з выбараў, пакуль не вядома. Калі зыходзіць з настрояў палітыкаў — удзельнікаў кампаніі, то наўрад ці...

Ігар МАРОЗАЎ.

ДАТА

Олег ГУЛАК:
«Будем держать глаза открытыми»

Республиканское правозащитное общественное объединение "Белорусский Хельсинкский комитет" отмечает 15-летие. БХК — почти ровесник президентского правления Александра Лукашенко, который, мягко говоря, не жалует правозащитников и не слишком церемонится с правами человека. Так что эта круглая цифра — уже достижение. Тем более что Белорусский Хельсинкский комитет — одна из немногих организаций Беларуси, которые легально занимаются защитой прав человека.

Какой ценой дались эти годы БХК, почему белорусская власть сплошь и рядом нарушает права своих граждан и есть ли просвет впереди?

Об этом — разговор с председателем БХК ***Олегом ГУЛАКОМ****.*

— Сам факт существования БХК в лукашенковской Беларуси — уже подвиг, учитывая отношение нынешней власти к правам собственного народа. Как, за счет чего организации удалось выжить?

— За счет многих факторов.

Массу времени и сил пришлось тратить, чтобы бороться с административными рогатками, которые ставили власти. Нас, однако, выручил высокий потенциал команды.

Но, пожалуй, еще более важно следующее: БХК имеет высокий моральный авторитет, что не позволило горячим головам во власти "убить" организацию. Опасность международного скандала удерживала власть от радикальных шагов.

Ведь все понимают: задача правозащитников — помочь государству быть хорошим. Это как у врача: мы делаем больно в благих целях, чтобы излечить.

— Чего удалось добиться БХК за эти 15 лет и что осталось нереализованным?

— Мы достигли многих побед, но еще больше случаев, когда наступало разочарование, что не удается пробить эту систему. Самое главное, чего нам, всем правозащитникам (я говорю не только о БХК), удалось добиться, — что права человека в нашей стране стали темой, которую нельзя не вспоминать, которую власти не могут забыть или замолчать. Но, увы, все же пока права человека остаются проблемной позицией и в государственной жизни, и в обществе.

— БХК — одна из немногих организаций, которые легально занимаются защитой прав человека в Беларуси. Как вы оцениваете ситуацию сейчас, во время президентской кампании?

— В целом она остается очень сложной. Но пока репрессии не превратились в инструмент решения политических проблем, в борьбе за власть.

— Президентские выборы — переломный этап в жизни любой цивилизованной страны. И роль правозащитников в этот период усиливается многократно…

— Наша роль — независимое наблюдение. Наша главная функция — отслеживать, давать оценки, насколько избирательный процесс соответствует белорусскому законодательству и международным стандартам…

— По прошедшим этапам кампании уже можно говорить о соответствии международным стандартам?

— До стандартов далеко, если говорить об этапе формирования территориальных и участковых комиссий.

Если говорить о регистрации инициативных групп и сборе подписей — здесь некий прогресс наблюдался. Но это было только начало. Мы держим свои глаза открытыми...

— Какие перспективы светят стране после выборов?

— Это вопрос, скорее, политический и из области прогнозов. Впереди — регистрация кандидатов, агитационная кампания, возможные массовые протесты. Все еще впереди...

Комментирует претендент в президенты Владимир Некляев:

— БХК 15 лет занимается непрерывной работой по защите прав человека в Беларуси. Это та общественная организация, которую нельзя упрекнуть в бездействии, чем она и заслужила авторитет в гражданском обществе. С этим авторитетом, заслуженным хорошей работой, как член Наблюдательного совета БХК я хочу поздравить всех членов БХК и тех, кто имеет отношение к защите прав человека в нашей стране!

Михаил ШЕВЧУК.

Усё на продаж?

Беларусь да канца 2013 года мае намер завяршыць акцыянаванне ўсіх дзяржаўных прадпрыемстваў, заявіла дырэктар Фонду дзяржаўнай маёмасці Беларусі Наталля Жарнасек.

"Сфарміраваны план прыватызацыі на 2011—2013 гады, у адпаведнасці з якім да канца 2013 года будзе завершана акцыянаванне ўсіх дзяржаўных прадпрыемстваў", — заявіла Жарнасек, выступаючы на Мінскім міжнародным форуме.

Чыноўніца ўдакладніла, што будзе акцыянавана больш за 500 дзяржпрадпрыемстваў. Аднак у гэты спіс не ўваходзяць прадпрыемствы электраэнергетыкі і газазабеспячэння, перадае "Інтэрфакс".

"Але ўвесь рэальны сектар будзе рэфармаваны. Мы таксама спадзяёмся, што і ў плане продажаў дзяржуласнасці наступны перыяд будзе больш паспяховым", — дадала Жарнасек.

НУ И НУ!

Русских в Беларуси стало на треть меньше, зато китайцев — в 20 раз больше!

Обнародованы сенсационные данные о национальном составе населения Беларуси.

Согласно переписи, прошедшей в октябре 2009 года, в десятку наиболее многочисленных национальностей, проживающих в Беларуси, попали:

1.Белорусы — 83,7%
2.Русские — 8,3%
3.Поляки — 3,1%
4.Украинцы — 1,7%
5.Евреи — 0,1%
6.Армяне — 0,1%
7.Татары — 0,1%
8.Цыгане — 0,1%
9.Азербайджанцы — 0,1%
10.Литовцы — 0,1%

По сравнению с предыдущей переписью, состоявшейся в 1999 году, доля белорусов в общем составе населения страны выросла на 2,5%. Но в буквальном исчислении белорусов стало меньше на 200 тысяч человек. Теперь к коренной национальности себя относят 7.957.252 жителя Беларуси против 8.159.073 в 1999 году.

За десять лет доля русских в населении Беларуси сократилась на 3%, а в буквальном исчислении их стало меньше на 356 тысяч человек — примерно на треть. Национальный статистический комитет считает, что это "связано как с естественной убылью населения, так и с миграционным оттоком". Таким образом, процесс "чемодан—вокзал—Россия" идет, несмотря на неоднократные утверждения Александра Лукашенко, что русским людям в Беларуси созданы лучшие условия, чем где бы то ни было, включая собственно Российскую Федерацию. Что ж они уезжают из нашего оазиса?

Впрочем, русские в этом не одиноки. Евреев в Беларуси стало меньше в 2,2 раза, украинцев — на треть, цыган — на 29%, отмечает интернет-сайт "Солидарность".

Зато численность китайцев, постоянно проживающих на территории нашей страны, выросла более чем в 20 раз, арабов — в 2,7 раза, туркмен — в 2,3 раза. Как отмечает Национальный статистический комитет, "доля представителей данных национальностей в общей численности населения страны пока незначительна". Пока?

ДЫСКУСІЯ

Замест перамогі прэзентацыя асобных палітыкаў?

Пасля таго як прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь здалі подпісы выбаршчыкаў за сваё вылучэнне ў тэрытарыяльныя камісіі, з'явілася магчымасць падвесці папярэднія вынікі працы штабоў і пагаварыць аб перспектывах.

Да якіх сцэнарыяў выбарчай кампаніі варта рыхтавацца яе ўдзельнікам? Ці ёсць верагоднасць з'яўлення адзінага кандыдата ад апазіцыі?

Адказы на гэтыя пытанні за "круглым сталом" шукалі кіраўнік выбарчага штаба Рыгора Кастусёва ***Аляксей ЯНУКЕВІЧ,*** *кіраўнік выбарчага штаба Уладзіміра Някляева* ***Андрэй ДЗМІТРЫЕЎ,*** *кіраўнік выбарчага штаба Алеся Міхалевіча* ***Юрый МЕЛЯШКЕВІЧ.***

— Першае пытанне да кожнага з вас: з якім пасланнем прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта, чые штабы вы прадстаўляеце, выходзяць да беларускага грамадства ў гэтай палітычнай кампаніі?

Леў Марголін, кіраўнік выбарчага штаба Яраслава Раманчука:

— Наша пасланне да беларускага грамадства вызначана фігурай нашага прадстаўніка. Мы свядома вылучалі не старшыню Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзьку, а менавіта эканаміста Раманчука, таму што сённяшняя сітуацыя карэнным чынам адрозніваецца ад сітуацыі, якая была ў 2006 годзе. Зараз, ва ўмовах эканамічнага крызісу, у сітуацыі сапсаваных адносін з Расіяй і Еўропай, нам важна дастукацца не толькі да тых 25 працэнтаў выбаршчыкаў, якія традыцыйна галасуюць за дэмакратычнага кандыдата, але і да тых 40 працэнтаў, якіх прынята называць "балотам". "Балотам", таму што ў пэўнай ступені яны не вызначыліся, у нейкай ступені для іх паняцце "апазіцыя" страшнае. Разам з тым гэтыя людзі адчуваюць, што краіна заходзіць у тупік і трэба нешта мяняць. На наш погляд, прапанаваць праграму такіх перамен можа якраз Яраслаў Раманчук.

Калі казаць у двух словах, то наша пасланне для беларускага грамадства гучыць так: краіне патрэбны эканамічныя рэформы.

У кожнага чалавека ёсць свая мяжа здольнасцяў. І што б пра Лукашэнку ні казалі яго прыхільнікі, маўляў, ён выкручваўся раней, выкруціцца і ў бліжэйшыя гады, але ў большай часткі людзей ужо ёсць разуменне, што яго ўзровень — узровень старшыні калгаса. Гэта здольнасць "закруціць гайкі" і нешта там у кагосьці пастарацца "ўрваць"... Краіне патрэбна новае дыханне і неадкладныя глыбокія эканамічныя і палітычныя рэформы.

Андрэй Дзмітрыеў, кіраўнік выбарчага штаба Уладзіміра Някляева:

— Пасланне, якое наша каманда і прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта Уладзімір Някляеў спрабуе данесці да беларускага грамадства, складаецца з дзвюх частак. Першае: беларускае грамадства ўжо стамілася ад канкрэтнай асобы. Безумоўна, у людзей ёсць перасцярога, што будзе з Беларуссю пасля Лукашэнкі, але ўжо ёсць і разуменне, што так быць не павінна. Лукашэнка вельмі доўга кіруе краінай.

У асобе Някляева мы прапануем альтэрнатыву Лукашэнку.

Другая частка паслання, з якім мы выйшлі на гэтыя выбары, заключаецца ў тым, каб растлумачыць людзям, якой Беларусь будзе пры Някляеве. Ён кажа: "Я прыйшоў, каб вы перамаглі!" Гэты лозунг раскрываецца для кожнай групы грамадства. Ён азначае, што ў выпадку прыходу Някляева да ўлады перамогуць прадпрымальнікі, моладзь, сем'і... Мы будзем казаць людзям, што Беларусь можа і павінна быць іншай: краінай з добрай адукацыяй, краінай з годнай працай для людзей, добрымі заробкамі і так далей.

Аляксей Янукевіч, кіраўнік выбарчага штаба Рыгора Кастусёва:

— Асноўным пасланнем Партыі БНФ людзям на гэтых прэзідэнцкіх выбарах з'яўляецца тое, што за апошнія 16 гадоў у Беларусі ніхто не займаўся абаронай нацыянальных інтарэсаў. Не займаўся гэтым ні Лукашэнка, ні апазіцыя, бо не магла гэтага рабіць. Мы выходзім да грамадства з пасланнем аб тым, што зараз Беларусі патрэбна сіла, партыя, якая на першы план будзе ставіць не нейкія ўнутраныя інтарэсы, а нацыянальныя.

Так, можна сказаць, што на нейкім этапе Лукашэнка, падмяўшы пад сябе ўсю краіну, абараняе нацыянальныя інтарэсы. Але нельга сказаць, што робіць ён гэта належным чынам. Ягоная абарона зводзіцца да абароны асабістых інтарэсаў і губляе для яго сэнс, калі ён не мае асабістай выгады з гэтага. Для нас, для Партыі БНФ і нашага прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта Рыгора Кастусёва, нацыянальныя інтарэсы складаюцца з трох чыннікаў: свабода, дабрабыт, бяспека.

На нашу думку, пераважная большасць сённяшніх прэтэндэнтаў у выпадку зыходу Лукашэнкі абсалютна нічога сабой не будуць уяўляць. Паколькі яны будуюць свае праграмы толькі на тым, што Лукашэнка кепскі. Так, шмат хто ад Лукашэнкі стаміўся, і шмат каго гэта ў апазіцыі натхняе. Але гэта не той фактар, які можа мабілізаваць грамадства. Мабілізаваць грамадства на сённяшні дзень можа толькі нацыянальная ідэя. Менавіта на гэтым мы стаім і будуем сваю кампанію. Якія сродкі мы для гэтага выкарыстоўвалі? Ясныя заявы. Быў распрацаваны маніфест аб абароне нацыянальных інтарэсаў, які быў прапанаваны да падпісання ўсім патэнцыяльным кандыдатам. Падпісалі не ўсе. Некаторыя, напрыклад Андрэй Саннікаў, адкрыта сказалі, што перамены да нас заўжды прыходзілі з Расіі, іншыя кандыдаты таксама пастараліся "саскочыць" з гэтага пытання. Мы свядома ідзём на абвастрэнне гэтага пытання, паколькі кампанія Кастусёва — гэта кампанія за тое, каб перспектыва ў беларускай нацыі была на дзесяцігоддзі. І на сённяшні момант можна гэтую перспектыву страціць — з Лукашэнкам ці з некім іншым, не так важна. Наша асноўная задача — зрабіць так, каб гэтая перспектыва страчана не была.

Юрась Меляшкевіч, кіраўнік выбарчага штаба Алеся Міхалевіча:

— Алесь Міхалевіч пазіцыянуе сябе як кандыдат не ад улады і не ад апазіцыі. Міхалевіч — прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта, які не звязаны палітычнымі догмамі, ён прадстаўнік абсалютна новай генерацыі. З'яўленне такога кандыдата, як нам падаецца, выклікана неабходнасцю, што паўстала ў нашай краіне ў сувязі з крызіснымі з'явамі. Міхалевіч у гэтым сэнсе паслядоўна паказвае сябе як антыкрызісны кіраўнік, у яго ёсць здольнасці для рэалізацыі антыкрызіснай стратэгіі. Яго непартыйнасць дазваляе пазбегнуць канкурэнцыі ў традыцыйным апазіцыйным асяродку, сярод тых, хто і так галасуе за кандыдатаў ад апазіцыі. Такім чынам можна павялічваць працэнт тых людзей, якія з розных прычын адмаўляюцца падтрымліваць апазіцыю, але схільныя выбраць кандыдата ў супрацьвагу Лукашэнку.

Важна сказаць, што мы падкрэсліваем неканфліктнасць Алеся, таму што грамадства не падтрымлівае ніводную з дактрын, якую вызначаюць палітычныя партыі. Няма такой праграмы, якая б цалкам адпавядала тым спадзяванням, якія ёсць у грамадстве. І мы шукалі такія моманты, за якія можна было б зачапіцца і будаваць сваю кампанію падчас агітацыі. Яны будуць агучаны пазней, пры агітацыі.

— Многія палітычныя эксперты зараз сыходзяцца на адной думцы: на гэтых прэзідэнцкіх выбарах Расія ўпершыню сур'ёзна гуляе на беларускім палітычным полі. У гэтым сэнсе прэзідэнцкія выбары праходзяць у зусім новых умовах. Ці дапаможа "расійскі фактар" перамозе беларускай апазіцыі?

Аляксей Янукевіч:

— Сённяшні беларускі рэжым разумее толькі тыя словы, якія гучаць у яго бок з пазіцыі сілы і з пазіцыі больш моцнага апанента. А мы такой сілы ўнутры краіны не маем. Такія моцныя суб'екты знаходзяцца па-за межамі Беларусі — гэта Крэмль і краіны Захаду. Праўда, Еўропа зараз не хоча размаўляць з пазіцыі сілы з беларускімі ўладамі, а Крэмль гэта рабіць спрабуе. Што з гэтага атрымаецца, усе мы пабачым. Але ў той жа час я не веру, што ў Крамлі зараз знаходзяцца людзі, якія мараць аб усталяванні дэмакратыі ў Беларусі. Расія можа дапамагчы толькі тым, каб на месца Лукашэнкі прыйшоў, скажам, Сяргей Сідорскі. Яны будуць бараніць у Беларусі толькі свае інтарэсы, а не нацыянальныя інтарэсы Беларусі.

Андрэй Дзмітрыеў:

— Усе кажуць, што Расія гуляе ў гэтых выбарах. А я б так не сказаў. Расія толькі з'явілася ў гэтых выбарах, а не гуляе. Калі кагосьці ўразіла з'яўленне дакументальных фільмаў пра Лукашэнку, то гэта нельга ўспрымаць як сур'ёзную гульню. Гэта проста абмен непрыемнымі вітаннямі. Каб усё было пасур'ёзнаму, мы б ужо бачылі "блакаду": калі сельскагаспадарчыя тавары, прамысловыя тавары з Беларусі раптам сталі б непрымальнымі для расійскага рынку. Калі "Нафтан" застанецца без нафты, а трубы без газу — вось гэта сур'ёзна.

Сёння мы не маем падстаў казаць, што Расія гуляе ў гэтыя выбары, што Расія не прызнае гэтыя выбары, што Расія не прызнае Лукашэнку. Мы пакуль бачым, што ёсць крызіс у адносінах паміж Лукашэнкам і тандэмам Пуцін—Мядзведзеў. Але гульні няма, мы яе чакаем і думаем, што будзе пасля выбараў.

Расія можа згуляць на палітычным полі Беларусі. З іншага боку, мы бачым вялікую стомленасць Еўропы і новую палітыку адміністрацыі ЗША ў дачыненні да Беларусі. Яна вельмі простая: "Хлопцы, разбірайцеся ў сваіх праблемах самі. Мы стаміліся да вас прыязджаць і нешта вам казаць. Бо выніку — нуль".

І Расія, і Еўропа жадаюць мець у Беларусі новага лідара, новага чалавека, з якім яны будуць дамаўляцца. Але за нас нічога рабіць не будуць. Для гэтага патрэбна аб'яднацца самой апазіцыі. Аляксей Янукевіч многа кажа пра нацыянальныя інтарэсы. Але трэба казаць, што гэта такія нацыянальныя інтарэсы, якімі іх уяўляе сабе Партыя БНФ. Хто сказаў, што толькі яны правы?..

На гэтым этапе апазіцыі неабходна кансалідацыя. На гэтым этапе трэба пакінуць асабістыя спрэчкі і рознагалоссі. Мы можам з Янукевічам па-рознаму глядзець на стасункі з Расіяй, але зараз мы на іх увогуле не ўплываем. Уплываць мы будзем толькі тады, калі будзем знаходзіцца ва ўладзе. А для таго, каб яе атрымаць, нам патрэбны толькі адзін цэнтр сілы — адзіны кандыдат на прэзідэнцкіх выбарах.

— Мы выйшлі на самае хвалюючае і спрэчнае пытанне, якое дыскутуецца ў грамадстве, — абранне адзінага кандыдата. Ці ёсць магчымасць аб'яднання?

Юрый Меляшкевіч:

— Натуральна, што неабходнасць каардынацыі дзеянняў паміж дэмакратычнымі кандыдатамі існуе. Ёсць пытанні, над якімі можна працаваць калектыўна, — гэта пытанне па назіранні за прарыстасцю выбараў, пытанне па забеспячэнні назірання за падлікам галасоў... Ці будзе Алесь Міхалевіч стаяць на плошчы, пра якую так многа гаворыцца ўжо сёння? Рашэнне на гэты конт будзе звязана з умовамі, у якіх пройдзе кампанія.

Аляксей Янукевіч:

— Што тычыцца перспектывы выхаду на адзінага кандыдата, то, безумоўна, гэта будзе залежаць ад таго, хто будзе зарэгістраваны, а хто — не. На жаль, гэты выбар застаецца ў руках улады. Калі дапусціць, што нашы прэтэндэнты будуць зарэгістраваны, то патэнцыяльна, канечне, можна думаць і размаўляць пра нейкія супольныя дзеянні, хаця перспектыва выхаду на адзінага кандыдата мне падаецца даволі складанай і спрэчнай. Але гэта тое пытанне, якое вырашыцца напярэдадні галасавання ці на самой плошчы.

Андрэй Дзмітрыеў:

— Аляксей, давай вырашым, хто будзе "адзіным", пасля плошчы... Гэта нешта новае ў стратэгіі беларускай апазіцыі...

Аляксей Янукевіч:

— Пасля выбараў гэта будзе новы палітычны цыкл...

Што на сённяшні момант можа даць выхад на адзінага кандыдата? Гэта можа даць дадатковую падтрымку ўнутры грамадства? Я сумняваюся. Ці, можа, гэта нам дасць больш людзей на плошчы? Я таксама сумняваюся, таму што кожны прыхільнік ідзе на плошчу за свайго кандыдата. Тыя, хто ідзе на плошчу супраць Лукашэнкі, будуць там і так — нават без кандыдатаў. Паставяць намёты, і кандыдаты на гэта ніяк уплываць не будуць.

Андрэй Дзмітрыеў:

— Някляеў заўсёды казаў і кажа: ёсць патрэба ў адзіным кандыдаце. Гэта наша пазіцыя. Хаця я згодны і з тым, што зараз абранне адзінага кандыдата можна разглядаць і з іншага ракурсу: а ці не нашкодзіць чалавеку гэты статус? Бо на яго накінуцца ўсе праблемы, якія апазіцыя назапасіла за гэты час.

І ўсё ж гэтае пытанне павінна вырашацца не асабістым меркаваннем — маім ці нечым іншым, а сацыялагічнымі даследаваннямі. Яны ёсць, і яны сведчаць, што адзіны дэмакратычны кандыдат атрымлівае адразу 20—25 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў проста таму, што ён адзіны. На мой погляд, гэта важкі аргумент на карысць выбару адзінага кандыдата.

Аляксей Янукевіч:

— Але гэта ўсё. Больш за гэтыя 20—25 працэнтаў ён нічога не атрымлівае…

Андрэй Дзмітрыеў:

— Аляксей, ты ведаеш, калі людзі падпісваліся за Някляева, Саннікава, Раманчука. Кастусёва, Міхалевіча і гэтак далей — што яны казалі? Яны казалі: "Ой, які добры Някляеў ці Кастусёў..."? Няпраўда гэта! Яны казалі наступнае. Па-першае, "Лукашэнка надакучыў", па-другое: "Хлопцы, калі вы ўжо нарэшце аб'яднаецеся?". Вось гэта было галоўным пасланнем народа да прэтэндэнтаў. Паасобку выбаршчыкі нічога не вырашаць, але яны гатовы прыцягнуцца да цэнтра сілы, а такіх цэнтраў у краіне, дзе ёсць дыктатура, можа быць толькі два — дыктатурны цэнтр і дэмакратычны цэнтр. І ў гэтым выпадку людзі прыходзяць на плошчу, бо яны ведаюць: тут ёсць наш кандыдат, і ён адзін.

Канечне, трэба клікаць людзей да выхаду на плошчу. Калі выбары сфальсіфікаваны — мы ідзём на плошчу, гэта тое, аб чым каманды могуць дамаўляцца. Мы размаўлялі пра гэта і з Раманчуком, і з Кастусёвым... Няхай ужо прэтэндэнты хоць пра плошчу гавораць адно і тое ж, а то назавуць чатыры месцы збору — і будзе ў нас чатыры "моцныя" плошчы. Карацей, наша пазіцыя такая: калі мы не абіраем адзінага — давайце дамаўляцца хаця б пра адзіную стратэгію. Але адзіны кандыдат патрэбен, усё астатняе — балбатня.

Леў Марголін:

— Я год таму ўзначальваў групу, якая распрацоўвала працэдуру выхаду на адзінага кандыдата. Праца скончылася беспаспяхова. Разумееце, не важна, ці будзе адзіны кандыдат у прынцыпе, а важна, якім ён будзе. Вы памятаеце наш вопыт 2001-га і 2006 гадоў, калі адзіны кандыдат быў не самым моцным. А чаму? Таму што "выходзілі" на яго штучным спосабам. Адзіная магчымасць праверыць свае сілы — правесці праймерыз (папярэдняе галасаванне) хаця б у асобным рэгіёне. На сённяшні дзень я не ўпэўнены, што можна выйсці на адзінага кандыдата.

Па-другое, я не ўпэўнены, што ён патрэбны. Паколькі ва ўмовах, калі сапраўдных выбараў няма, можа быць, куды важней, каб, скажам, сем зарэгістраваных кандыдатаў выкарысталі па гадзіне эфірнага часу і выступілі па тэлебачанні, радыё, сказалі пра сваю пазіцыю, пра тое, што адбываецца ў краіне, што Лукашэнка надакучыў, што ён карыстаецца не 70 працэнтамі падтрымкі, а максімум трыццаццю...

На плошчу мы пойдзем, таму што ў справядлівасць выбараў мы не верым. І людзі павінны адстаяць свае правы на чэсныя выбары. Ці пашкодзіць плошчы, калі на ёй будзе чатыры ці пяць кандыдатаў? Не пашкодзіць, калі яны збяруцца разам. Плошчай павінны кіраваць самі людзі, а не кандыдаты. Калі ў грамадстве будзе ўпэўненасць, што Лукашэнка не набраў 50 працэнтаў галасоў, тады магчымы перамены.

Падрыхтаваў Віталь ГАРБУЗАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ

Пакуль мы пакідаем без каментарыяў выказванні кіраўнікоў перадвыбарных штабоў, бо хочам, каб менавіта выбаршчыкі, вы, паважаныя чытачы, выказалі свае меркаванні на гэты конт. Скажам толькі: стратэгія ўдзелу ў выбарах павінна быць пераможнай, а не прэзентацыяй асобных палітыкаў. На жаль, пакуль тое, што мы бачым, — гэта парад амбіцый. Тыя ж прадстаўнікі апазіцыі абыходзяць бокам самыя вострыя пытанні, звязаныя з далейшым знаходжаннем на пасадзе прэзідэнта А.Лукашэнкі. Ствараецца ўражанне, што яны яго проста баяцца. Нават той жа лідар кампаніі "Гавары праўду!" У.Някляеў замоўчвае самыя балючыя пытанні, агучванне якіх магло б сапраўды сур'ёзна паўплываць на свядомасць выбаршчыкаў, іх пазіцыю падчас галасавання.

Адным словам, у краіне пакуль не адчуваецца моцнай, вострай барацьбы за перамены, за тое, каб на пасадзе прэзідэнта з'явіўся новы чалавек. Па ўплыве на электарат адзін вечар на тэлеэкранах А.Лукашэнкі пераўзыходзіць у дзясяткі разоў усе намаганні яго сапернікаў, якія спавядаюць тактыку хаджэння "ад кватэры да кватэры". Апаненты ўлады чамусьці не робяць стаўку на тое, каб усё ж прымусіць улады пайсці на выкананне абавязковых умоў правядзення сапраўды дэмакратычных выбараў:

1) удзел ва ўсіх выбарчых камісіях прадстаўнікоў апазіцыйных кандыдатаў;

2) свабодны доступ да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі не толькі для А.Лукашэнкі, але і для яго апанентаў;

3) згортванне датэрміновага галасавання (з мэтай выключэння фальсіфікацый);

4) публічны падлік галасоў.

У белых пальчатках улада не заваёўваецца. Аб гэтым, здаецца, ведаюць усе, акрамя тых, хто падаў заяву на ўдзел у спаборніцтве з А.Лукашэнкам. Таму і распачатая выбарчая кампанія нагадвае не востра прынцыповую барацьбу, а, хутчэй, дзіцячыя гульні. Шкада, але ад такіх гульняў беларускае грамадства нічога станоўчага не атрымае.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
9—11 ЛІСТАПАДА 2010 г.

ПРАШУ СЛОВА!

Паважаная "Народная Воля"!

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў праўладныя афіцыёзныя СМІ перапоўнены ўхвальнымі матэрыяламі на адрас рэжыму Лукашэнкі. Прычым панегірыкі ў падтрымку ўлад выдаюць і Беларускае тэлебачанне, і радыё, і друкаваныя выданні. Не адстаюць у гэтай справе таксама і рэгіянальныя дзяржаўныя газеты. Напрыклад, возьмем №117 нашай мясцовай газеты "Калінкавіцкія навіны" (ад 19 кастрычніка 2010 года). На першай старонцы пад набраным вялікімі літарамі загалоўкам "Почему я ставлю подпись за действующего президента?" чытачы могуць прачытаць меркаванні жыхароў Калінкавіч наконт таго, чаму яны сваім подпісам падтрымалі вылучэнне Аляксандра Лукашэнкі на чарговы прэзідэнцкі тэрмін. Зразумела, што супрацьлеглага пункту гледжання вы ні ў гэтым, ні ў іншых нумарах раёнкі не знойдзеце, бо ў Беларусі ёсць толькі адзін палітык, які да таго ж "крышку вышэй за Бога".

Увогуле, сукупнасць такіх вось "одобрямс" стварае карціну як быццам усеагульнай падтрымкі сістэмы. Ну поўнае дэжавю з савецкім мінулым. Толькі раней казалі пра адзінства камуністаў і беспартыйных, а зараз лукашэнкаўскія ідэолагі пераконваюць у "сплоченности всех слоев и групп населения" ў сваім жаданні падтрымаць Аляксандра Лукашэнку на выбарах. Таму я, як грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які адмоўна ставіцца да чарговага вылучэння Аляксандра Лукашэнкі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты, хачу праз любімую "Народную Волю" распавесці жыхарам Калінкавіч, а таксама і ўсёй Беларусі,

Чаму я не паставіў подпіс за дзеючага прэзідэнта

1. За час знаходжання Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта насельніцтва Беларусі (па даных праведзенага ў мінулым годзе агульнарэспубліканскага перапісу) зменшылася амаль на 500.000 чалавек! Алкагалізацыя нацыі дасягнула крытычнай рысы, за якой пачынаюцца працэсы дэградацыі і выраджэння.

2. За час знаходжання Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта быў адменены цэлы шэраг ільгот і сацыяльных гарантый (на праезд у гарадскім транспарце, на аплату лекаў і зубапратэзаванне, на бясплатнае аздараўленне і г.д.). Была ўведзена плата за карыстанне падручнікамі ў агульнаадукацыйных сярэдніх школах, значна скарацілася колькасць бюджэтных (бясплатных) месцаў у дзяржаўных ВНУ.

3. За час знаходжання Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта значная частка дзяржаўнага бюджэту была выдаткавана на рэалізацыю сумніўных і выключна іміджавых для дзеючага кіраўніка дзяржавы праектаў. Напрыклад, масавае будаўніцтва лядовых палацаў ці арганізацыя за кошт сродкаў дзяржбюджэту фестываляў і святаў, якія прапагандуюць нізкапробнае музычнае мастацтва (як кажа народ — папсу). І гэта ў той час, як у Калінкавічах больш за 100 будынкаў маюць прапушчаныя тэрміны капітальнага рамонту! (Думаю, што сітуацыя з капітальным рамонтам жылля ў іншых рэгіёнах стаіць таксама вельмі востра.)

4. За час знаходжання Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта павялічыўся бюракратычны апарат, былі створаны шматлікія кантралюючыя органы і новыя спецслужбы, на ўтрыманне і тэхнічнае забеспячэнне якіх трацяцца велізарныя сродкі. Але эфектыўнасць іх працы па барацьбе з крымінальнымі злачынствамі застаецца даволі нізкай. Інакш чым можна патлумачыць факт, што банды "марозаўцаў" і "пажарнікаў" свабодна дзейнічалі больш за 10 год?

5. За час знаходжання Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта было распрацавана і ўведзена несправядлівае і дыскрымінацыйнае заканадаўства аб пенсійным забеспячэнні. Для большай колькасці насельніцтва быў уведзены так званы максімальны каэфіцыент, у выніку чаго людзі, якія адпрацавалі дзясяткі гадоў на вытворчасці і ў сельскай гаспадарцы, у медыцыне і адукацыі, атрымліваюць пенсію ў некалькі разоў меншую, чым дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, чыноўнікі, міліцыянеры, супрацоўнікі КДБ і іншыя "элітныя" катэгорыі, пра якія так клапоціцца Аляксандр Лукашэнка.

6. За час знаходжання Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта быў фактычна замацаваны курс на замоўчванне і апраўданне сталінскіх злачынстваў, былі перапісаны падручнікі па гуманітарных дысцыплінах, з праграм па літаратуры па палітычных прычынах былі выкінуты высокамастацкія творы знакамітых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. А "рэформы" ў гістарычнай навуцы прывялі да таго, што беларускім школьнікам прапануюць браць прыклад з сумнавядомага Мураўёва-вешальніка, на чыім сумленні тысячы і тысячы жыццяў беларускіх патрыётаў — удзельнікаў паўстання 1863—1864 гадоў на чале з нацыянальным героем Беларусі Кастусём Каліноўскім.

Зразумела, што спіс гэты можна доўжыць і доўжыць, бо за час свайго панавання рэжым Лукашэнкі нагрувасціў столькі, што дэмакратычнаму прэзідэнту і ўраду прыйдзецца разбірацца з цяжкай спадчынай дыктатуры не адзін год.

Дзяніс Леанідавіч РАБЯНОК,
грамадскі актывіст.

г.Калінкавічы.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Мова не загіне...

"Беларускай мове ва Украіне плануецца надаць статус рэгіянальнай".

"Народная Воля"

Яна і ў нашае дзяржаве
Рэгіянальная даўно.
Пры ўладзе сённяшняй
Наяве
Ёй перспектывы не відно.
І ўсё-ткі мова не загіне,
Хоць затаптана сёння ў гной,
І будзе жыць ва Украіне —
Няхай і ў вёсачцы адной.

Лішні клопат

"Мы будзем паціху "сціскаць" дапамогу па беспрацоўі", — заявіў прэзідэнт.

Дапамога па беспрацоўі ў Беларусі складае крыху больш за 15 долараў. Ва Украіне ж — 70, у Расіі — 130.

З беспрацоўем трэба нам змагацца!
Толькі паўстае пытанне — як?
Можна проста: забяспечыць працай
Розных беспрацоўных-небарак.
Лішні клопат...
Развіваць навошта
Бізнес і вялікі, і малы?
Можна абысціся меншым коштам
(Хоць жа спосаб гэты трохі злы).
Беспрацоўным трэба дапамогу
"Сціснуць",
Каб была "ніжэй травы".
Аддадуць, як кажуць, душы Богу,
І паказчык будзе нулявы.

Беларус не дзьме і ў вус

Паводле вынікаў перапісу, толькі 23 працэнты беларусаў размаўляюць дома на роднай мове...

У адным з інтэрв'ю вядомы расійскі спявак Эдуард Хіль (беларус па мацярынскай лініі) на пытанне "Ці ведаеце вы родную беларускую мову" адказаў: "Ну вядома ж!"

Паверыць інтэрв'ю гатовы,
Хоць сумняваюся, што быль.
— Я ведаю, паверце, мову! —
Сказаў спявак расійскі Хіль.
"А я не ведаю!" — анкеты
Вось так запоўніў беларус.
І ганарыцца нават гэтым!
Жыве-жуе —
Не дзьме і ў вус...

Невукі

На кожнага настаўніка ў нашай краіне прыходзіцца менш за 10 вучняў.

...Прыклады памылак у дыктантах па рускай мове, якія дапускаюць студэнты Педуніверсітэта імя М. Танка: "сиртефикат", "аттистат", "ббал".

Чым болей педагогаў,
Тым спадручней
Навуку вучням
Убіваць у клёк.
Чаму ж так многа непісьменных вучняў?
Чаму непладавіты школьны ўрок?
І будуць жа
(На гора маме з татам)
Заўсёды непісьменнымі яны,
Бо ў педагогі
З гэткім "аттистатом"
Імкнуцца толькі невукі адны.

Дасягненне

Беларусь праяўляе зацікаўленасць у магчымым удзеле ў здабычы нафты на тэрыторыі Гамбіі, заявіў кіраўнік Міністэрства замежных спраў Сяргей Мартынаў.

Аднак нафта ў Гамбіі існуе толькі ў гіпотэзах. Пакуль сама краіна імпартуе паліва з Сенегала.

Ніхто ўжо нас не любіць за мяжою:
Амерыка нас зганьбіла даўно,
Расія раптам стала нам чужою,
З Еўропы рэвэрансаў не відно.
— Ды засмучацца ўсё ж пакуль што рана, —
Даводзіць нам міністр замежных спраў. —
Сябруем добра з Кубаю, з Іранам,
І Блізкі Усход
Яшчэ бліжэйшым стаў.
Вось Гамбія яшчэ...
Там многа нафты!
(Бо так сказаў тамтэйшы іх шаман.)
На танкерах адтуль вазіцьмем фрахтам,
Не перашкода мора-акіян.
Цяпер ніхто пускаць не будзе стрэлы:
Маўляў, урад рубель не беражэ
І возіць нафту аж з Венесуэлы.
Бо Гамбія хоць трохі, ды бліжэй.

З РЭДАКЦЫЙНАЙ ПОШТЫ

Аддзячылі

Наколькі мне вядома, у нашай сінявокай — два з паловай мільёны пенсіянераў. Мой стары знаёмы Уладзімір Міхайлавіч Філіповіч, як і я — у ліку гэтай пенсіённай арміі. Напрыканцы кастрычніка абое трапілі на шпітальны ложак, аказаліся суседзямі па палаце. Натуральна — паміж працэдурамі — гутарылі пра сваё жыццё-быццё, пра сітуацыю ў краіне, пра маючыя адбыцца прэзідэнцкія выбары. Меркавалі, за каго ж нам цяпер галасаваць... Мы абодва шмат гадоў адпрацавалі на Смалявіцкай птушкафабрыцы: Уладзімір Міхайлавіч — 40 гадоў, а я — 16. Успомнілі, што многія з нас раней падтрымлівалі цяперашняга кіраўніка дзяржавы, што спадзяваліся на ягоныя абяцанні. Але што ў выніку, што памянялася да лепшага? Прыйшлі да высновы, што рэальна жыць стала ніколечкі не лепш, што проста выжываем, а не жывём. Пенсіі хапае якраз на гэтае выжыванне, відаць, і памром так — ледзь зводзячы канцы з канцамі. Як паслухаеш радыё ці Беларускае тэлебачанне, то проста не верыш, дзе гэта мы жывём — у Беларусі ці ў якой Бельгіі... Раней хоць нейкая ўвага была да старых і нямоглых, такая-сякая дапамога, акрамя той пенсіі. А цяпер... проста здзек.

Уладзімір Міхайлавіч праілюстраваў тое на жывым прыкладзе. Летась, казаў ён, на Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі дырэктцыя птушкафабрыкі "прэміравала" мяне ды іншых старых... ажно пятнаццаццю тысячамі рублёў. Гэта ж пры саветах на 15 тысяч можна было купіць два аўтамабілі, а цяпер на іх і адной курынай тушкі не купіш. Ці, можа, забыліся, начальнікі, у які час жывем?.. Але ж ніякага сораму, бач. Ну, як быццам мы бамжы, гатовыя за "раз паесці" ледзьве не ў ножкі пакланіцца гаспадарам. Але што ты зробіш, калі ў людзей пачуццё сораму і не начавала... Прыйшлося за тую "прэміяльную тушку" даплачваць з мізэрнай пенсіі. Уладзімір Міхайлавіч расказваў, як на ўласныя вочы бачыў: адна старэнькая, былая работніца птушкафабрыкі, прасіла прадаўшчыцу фірменнай крамы "Браты Грыль" адрэзаць ногі ў тушкі, бо на большае не хапала грошай. Ці ж не сорам?! Вядома, ганьба такім начальнікам і іх ідэолагам. Але перадусім ганьба гэтаму рэжыму, які трымае нас за быдла...

Каб сказаў, што птушкафабрыка на ладан дыхае, то іншая справа. Але ж трубяць, што дужа паспяховае прадпрыемства, што рэнтабельнае, высокапрыбытковае...

Можа, яно і так, дык навошта было рабіць такія падачкі?.. А можа, вырашылі з іх дапамогаю спісаць сапсаваную прадукцыю, якую вывалілі ў зямляную яму паблізу вёскі Сакоўка?.. Уладзімір Міхайлавіч якраз і жыве ў гэтай вёсцы, а яна прымыкае да птушкафабрыкі. "Улетку, кажа, — не паверыш — акурат як стаяла на дварэ спякота, у тую яму згрувасцілі тысячы галоў здохлых курэй. Вазілі цэлымі прычэпамі... Смярдзела так, што мясцовыя людзі выклікалі санэпідэмстанцыю. І толькі пасля гэтага бульдозер закапаў тое страхоцце". Карацей кажучы, лепш закапаць тых бройлераў у зямлю, чым не дапусціць падзяжу птушкі ды па-сапраўднаму аддзячыць ветэранам за іх шматгадовую працу... Але ў нас так, як ёсць. Галоўнае — пракукарэкаць пра бацькоўскі клопат да пенсіянераў.

Вось і думай цяпер, за каго галасаваць. Выпісваючыся з больніцы, мы для сябе вырашылі, за каго аддадзім свае галасы. Правільней сказаць, дакладна вызначыліся, за каго не аддадзім свой голас.

Генадзь ШУКАН,
вёска Зарэчча
Смалявіцкага раёна.

ПОЗИЦИЯ

Если не изменимся мы сами...

Менталитет народа формируется на протяжении веков. Простой люд всегда ненавидел бояр и верил, что если придет "хороший" царь, то все заживут счастливо. Эта вера, так ничем и не подтвержденная, жива еще до сих пор. Нынешние слуги народа — чиновники, депутаты и номенклатура — можно сказать, построили коммунизм для себя и отдавать его без боя не собираются. Идеология лжи и обмана в сочетании с инквизиторскими методами борьбы с инакомыслием выдрессировали (извините за выражение) избирателя в духе "как начальство скажет, так и проголосуем".

Поиск и разоблачение "врагов народа" настолько укоренились в генах нескольких поколений, что многие и сегодня тешат себя дешевой приманкой типа "борьба с коррупцией". Интересно, чью участь она (вернее, видимость этой борьбы) облегчила? Некоторые до сих пор находятся в плену иллюзий, продолжая верить официальной пропаганде, а не своим глазам, своему рассудку.

Коррупция проникла во все сферы нашего бренного бытия. Взятки чиновникам приводят к тому, что они начинают смотреть на клиента как на дойную корову: чем больше дашь "в лапу" — тем больше надежд, что твой вопрос будет решен. И это лишь один пример.

При назначении на должности в госструктурах, особенно среднего звена, нередко руководствуются не деловыми качествами кандидата, а придерживаются закона кумовства. Круговая порука связала государственную систему по рукам и ногам. Попав в категорию номенклатуры, чиновник — если только он не отчебучит чего-нибудь уж из ряд вон неадекватного, может быть уверен, что система его накормит и обеспечит, не даст в обиду. "Низы" считают, что раз "верхи" воруют и безобразничают безнаказанно, то и им не грех подобрать хотя бы крохи, что падают с барского стола...

Не зря говорят: хочешь узнать, что за человек, дай ему должность. И чем выше он поднимается по служебной лестнице, тем больше у него появляется друзей, знакомых, родственников со своими аппетитами. А кто их всех кормит? Народ, которому достаются крохи, но который помалкивает, ибо и этого может не быть.

Есть реальный способ очищения от коррупции и всего, что она за собой влечет, — создание цивилизованного демократического государства, где царствует свобода слова и верховенство конституционных прав граждан. Там каждый факт коррупции и злоупотребления чиновников, как рентгеном, будет просвечиваться СМИ и побуждать власти принимать действенные меры.

Сегодня контролирующий (якобы контролирующий) аппарат у нас настолько разбух, что его структурам уже стало тесно и они стали толкаться друг с другом. А тем временем обществу — через телевидение, кинематограф — практически навязывают восхищение криминалом. Кумир части молодежи — Саша Белый и его бригада. Очень модным считается похвастаться знакомым какой-нибудь провернутой аферой, когда, не работая, можно получить деньги. И хотя у нас растет количество храмов, спортивных сооружений, детских домов для брошенных родителями детей, пока что алкоголиков и преступников не становится меньше. Население, особенно сельское, спивается, численность жителей страны падает едва ли не как в военное время. И это — хваленая "стабильность", "процветание"? Нет, результат того, что в стране все делается больше для показухи, а не для реального улучшения жизни людей.

Иллюзией является и то, что у нас якобы уже существует демократия. На самом же деле — псевдодемократическая система при мнимой многопартийности.

Государственная система в Беларуси похожа на гибрид ливийской Джамахерии с уклоном в нищету и "республики" батьки Махно, короткое время просуществовавшей в Украине. Демократия не может существовать в стране, где не все граждане не являются законопослушными и где к каждому оппоненту относятся как к врагу.

Если уж винить кого за наши беды, то не только Лукашенко, а прежде всего себя. Никто насильно за уши не тянул за него голосовать и тем более — давать мандат на пожизненное правление. Почему сталинский режим так долго свирепствовал в стране? А потому, что люди вели себя, как кролики, загипнотизированные удавом, надеясь, что репрессии обойдут их стороной. Так и наш обыватель предпочитает, как страус, прятать голову в песок и ждать, когда с неба свалится манна небесная.

Считаю, что одной сменой власти мы не достигнем желаемого результата, если не изменимся сами. Не научимся думать, к чему приведут завтра наши сегодняшние поступки, если перед тем как опустить бюллетень в урну, не взвесим все "за" и "против" того или иного кандидата. Ведь выбирать нам — не модель нового костюма, а будущее. И сейчас мы подошли к переломному моменту, после которого уже что-то исправлять будет поздно.

С уважением —

Василий КУРПАТИН.

Могилев.

БЫЛО...

За мянушку з імем «вождя» — 10 гадоў катаргі

У вёсках да вайны і пасля яе большасць жыхароў мелі мянушкі, падчас грубаватыя, зняважлівыя для іх носьбітаў. Вось і жыхару вёскі Сярагі Слуцкага раёна Рыгору Фёдаравічу Шахновічу далі мянушку "Сталін". За якія-такія "заслугі" — ніхто толкам не скажа, магчыма, за густыя вусы і крыху гарбаты нос. Яму самому такая мянушка, вядома, не спадабалася, бо за такое ў 30-я гады, калі ішлі масавыя рэпрэсіі, можна было трапіць у НКВД. Але тады ўсё абышлося.

Летам 1944 года, калі прагналі нямецкіх акупантаў, 40-гадовага Рыгора Фёдаравіча, як і іншых мужчын-прызыўнога ўзросту, забралі ў дзеючую армію. Ён трапіў у пяхоту. Зрэдку дасылаў жонцы пісьмы-трохкутнічкі, а потым замоўк. Яна думала, што загінуў, бо ў вёску пад восень пахаванкі сталі часцяком прыносіць. Што было далей са "Сталіным", даведаліся пасля вайны, калі вярнуліся ў вёску ацалелыя салдаты. Хадзілі ад іх чуткі, што калі паліторук роты перад атакай скамандаваў "За Родину! За Сталина! Вперед!", Рыгор Фёдаравіч прызнаўся яму, што таксама "Сталін", маўляў, у вёсцы мянушку такую далі.

Праз некалькі гадзін яго выклікалі ў "асобы аддзел" палка. І яго на дзесяць гадоў адправілі ў канцлагер. Вярнуўся адтуль толькі ў 1954 годзе, пасля смерці "вождя всех народов". Застаў дома двух дарослых сыноў. Трэці, самы старэйшы, Яўген, адслужыўшы ў войску, дамоў не вярнуўся. Малодшы за яго, Віктар, працаваў у калгасе ў будаўнічай брыгадзе, трэці, Леанід, стаў механізатарам. Бацька па вяртанні працаваў у паляводчай брыгадзе.

Пасля дзесяці гадоў няволі ў пастарэлага, схуднелага ад лагернай галадухі Рыгора Фёдаравіча ў абліччы мала што засталося ад таго маладога. Аднак вяскоўцы па старой звычцы, як і да вайны, называлі яго між сабою "Сталіным". Дарэчы, як прыпамінаюць сёння старажыхары, быў і свой "Калінін". Мала хто з мужчын у тагачаснай вёсцы на 200 двароў не меў сваёй мянушкі.

Міхаіл ТЫЧЫНА,
жыхар г.Слуцка.

«НЕПРЫЧАСАНАЕ» ПІСЬМО

Зноў не здаў пустыя бутэлькі...

Колькі помню савецкую ўладу, столькі помню і праблему са здачай шклатары (то ўсе пункты зачынены, то няма скрынак, то не далі грошай, то яшчэ якая-небудзь халера...).

Вось і сёння пайшоў здаваць пустыя бутэлькі, розныя слоікі. Жыву на завулку Казлова, а пунктаў побач няма, трэба цягнуцца амаль за два кіламетры. Дайшоў да Запарожскай, бутэлькі 0,5 "Крышталь" не прымаюць, па 2-ім завулку Баграціёна — перападлік, на Мендзялеева не прымаюць. Так і прыплёўся з поўнай торбай назад. Праўда, зэканоміў 2800 рублёў (хадзіў жа пешшу).

Добра, што ў 77 гадоў ёсць яшчэ нейкае здароўе. Мабыць, ад бацькоў, якія не ведалі, што такое гарэлка. Тата паспрабаваў "Московскую" ў 1939 годзе (яму было тады 30 год), калі ўслед за савецкімі танкамі завезлі да нас, у Заходнюю Украіну, гарэлку і кільку (добра гэта помню, бо было мне ўжо 6 год). Завезлі, бо трэба было ствараць паўсюль "советскую общность", а яна бывае толькі п'яная і бедная.

Сам я таксама амаль што не п'ю, кінуў паліць у 27 гадоў. Летам збіраю ягады, грыбы, ва ўсе сезоны займаюся рыбалкай. І як усе старыя (і не толькі) збіраю і здаю бутэлькі, мне не сорамна, я ж не краду.

У лістападзе ў маіх родных і блізкіх чатыры дні нараджэння, у студзені будзе два, у лютым — чатыры. Так што трэба збіраць капейчыну да капейчыны. У госці ў Беларусі (як і ва Украіне) з голымі рукамі не ходзяць. Але як ты тут збярэш, калі пустыя бутэлькі цяжка здаць. Што за ўлада, якая такое дробязнае пытанне вырашыць не можа?

Надзей на лепшыя часы не маю. За Лукашэнку, які парушыў Канстытуцыю, на якую клаў руку і кляўся, ніколі не галасаваў і галасаваць не буду.

Міхась Сямёнавіч ГАЛАС,
пенсіянер,
жыхар Мінска.

БОЛЬ

Мы только хотим возвратить заработанное умом и потом

Уважаемая редакция!

Только через вашу газету можно всенародно обсудить проблемы, которые волнуют многих жителей Беларуси моего поколения. Обращается к вам мальчик военных лет, пятый в семье. Старшему было тогда 14 лет, меньшему два года, и всех на ноги ставила солдатская вдова. Ни у кого из нас не было настоящего детства, да и юность была голодной.

О войне мы знаем не по наслышке. Жили недалеко от реки Прони, где девять месяцев стоял фронт. Помним печные трубы вместо домов...

Повзрослев, мы помогали родному колхозу. За труд нам писали трудодни, за которые ничего не платили. Потом довелось стоять на страже границ огромной державы — в Заполярье и в пустыне, поднимать разрушенное войной хозяйство, трудиться, где приказывали партия и правительство.

Каждый из нас, детей большой семьи, имеет по сорок и более лет трудового стажа, множество благодарностей и наград от руководителей и командиров. За те годы нам удалось накопить какие-то сбережения, которые вкладывались в "надежный" советский сбербанк. Но на нашу долю — да разве только на нашу? — выпало три, а может, и больше денежных реформ, несколько добровольно-принудительных займов, от которых всегда в выигрыше оказывались власть имущие, чиновники у государственных кормушек. Ведь не за свои же трудовые они сегодня у больших и малых городов поставили княжеские хоромы. А мы, простой народ, имели только галопирующую инфляцию.

Поскольку мы живем, как я слышу каждый день, в "процветающей" стране, я обратился в Администрацию президента с вопросом: нельзя ли хотя бы частично возвратить наши вклады? Письмо мое было переадресовано в Минфин, откуда я получил ответ, что денег нет, ждите до лучших времен...

Мое поколение уже уходит в иной мир, многим за 80 лет. Сказываются старость и болезни — послевоенные дети уже пенсионеры. Неужели президент и его правительство не могут позаботиться о своих гражданах, кто отстаивал интересы государства в самое трудное время? Мы ничего у государства не отрываем, мы просим хотя бы частично и поэтапно возвратить наше, кровное, что мы заработали умом и потом. Нас совсем мало осталось, скоро не будет кому и возвращать. Даже хоронить нас будет не за что...

С уважением —

Владимир Семенович КОНОПЛЕВ,
73 года.

г.Лида.

ФАКТ

В Казахстане прибавка к пенсии у детей войны в два раза больше, чем в Беларуси у инвалидов войны

Пишет вам ваш постоянный подписчик Александр Данилович Сорочинский. Я — инвалид войны I группы. Хочу через газету задать только один вопрос руководству страны. Наш президент неоднократно заявляет о том, как трепетно государство заботится о пенсионерах и инвалидах. Но мне хотелось бы знать, как при такой "заботе" получилось, что я как инвалид войны I группы получаю прибавку к пенсии в размере 30.000 рублей (10 долларов), а мой брат, проживающий в Казахстане, — 20 долларов. Хотя эта надбавка там дается не инвалидам, а детям войны. В Украине дети войны также получают надбавку к пенсиям значительно большую, чем в Беларуси инвалиды войны. Скажу честно, мне не просто обидно, но и стыдно за такие гроши от государства.

Александр Данилович СОРОЧИНСКИЙ.

г.Борисов.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
9—11 ЛІСТАПАДА 2010 г.

КОРАТКА

Выбары ў Азербайджане

Кандыдаты ад кіруючай партыі Ільхама Аліева "Новы Азербайджан" атрымалі больш за палову галасоў на выбарах у парламент краіны.

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама заявіў аб адсутнасці сур'ёзных парушэнняў. Лідары апазіцыі сведчаць аб тым, што многія яе кандыдаты не былі зарэгістраваны без тлумачэння прычын. Прадстаўнікі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе гавораць аб фактах запалохвання выбаршчыкаў, аб тым, што ў час галасавання яны сутыкнуліся "са значнымі абмежаваннямі" з боку ўлад.

Растуць цэны на золата

З пачатку года золата стала даражэйшым на 22 працэнты, і цяпер цана складае 1397,7 долара за унцыю. Аналітыкі лічаць, што за бліжэйшыя 12 месяцаў яна можа вырасці да 1650 долараў за унцыю.

Босая Мішэль танчыла ў Індыі

Мішэль Абама, якая суправаджала свайго мужа, прэзідэнта ЗША, у Індыю, у Мумбаі сустрэлася з 33 індыйскімі сіротамі ва ўзросце ад 8 да 13 гадоў.

Разам з дзецьмі яна танцавала пад музыку з індыйскага фільма "Колер шафрана". На фота, якія змясцілі сусветныя СМІ, бачна, як Мішэль у стракатай сукенцы босая танчыць з індыйскімі дзецьмі.

У гэты час яе муж, прэзідэнт ЗША Барак Абама, зрабіў шэраг важных заяў. У прыватнасці, ён сказаў, што лічыць Азію, асабліва Індыю, рынкам будучыні, што далейшае адкрыццё рынкаў Індыі для амерыканскага экспарту мае рашаючае значэнне для росту занятасці ў ЗША і эканамічнага прагрэсу для абедзвюх краін.

84-гадовая каралева і інтэрнэт

Каралева Вялікабрытаніі Елізавета II завяла афіцыйную старонку ў сетцы Facebook.

На старонцы The British Monarchy будуць відэаролікі і фота аб жыцці каралевы і другіх членаў яе сям'і. 84-гадовая каралева ўжо асвоіла электронную пошту, каб весці перапіску з унукамі. Яе супруг, 89-гадовы прынц Філіп, лічыцца сапраўдным энтузіястам у Сусветнай павуціне.

Кітай сабраўся на Месяц

